КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 1

ВІЛЬНЯ 1936 ГОД

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Складка на год—4 зал., на паўгода—2 зал.
Адна кніжка—1 зал.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

ЗЬМЕСТ

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 1(5) 1936 г. Год II

* * *

Патрэба беларускага літаратурна-навуковага часапісу ў Заходняй Беларусі адчувалася даўно. Урэшце гэткі часапіс паявіўся. Ёсьць ім — ужо добра нашаму грамадзянству ведамае — „Калосьсе“. Арганізаваньне яго ня было справай лёгкай. Многа было ўсякіх труднасьцяў і перашкодаў. Усё гэта аднак удалося перамагчы і прыступіць да выдаваньня часапісу.

За мінулы год „Калосься“ вышлі 4 сшыткі, гэта знача столькі, колькі было ў намеры выдавецтва. Такім чынам часапіс наш данае грамадзянству слова стрымаў.

Праўда, гэтыя чатыры сшыткі „Калосься“ — гэта яшчэ даволі скромныя пачаткі. Беларускай аднак літаратуры і навуцы ёсьць яны позытыўным укладам. Спатыкаем у іх цэлы рад твораў з краснага пісьменства, а таксама арыгінальныя навуковыя працы і рэцэнзіі, што ўсё разам зьяўляецца хоць невялікім, але сусім рэальным укладам у скарбніцу беларускай культуры.

Мусім так-жа сказаць, што ня лічачы нямногіх выняткаў, беларускае грамадзянства аднеслося да нашага часапісу агулам здаваляюча. Відаць гэта як з прыхільных да нас лістоў і водзываў, так і з грашовых складак і з агульнага нашым выдавецтвам зацікаўленьня беларускага грамадзянства розных кірункаў і паглядаў.

А гэта нам парука таго, што мы стаімо на добрай дарозе і што простым шляхам ідзём да сваей галоўнай мэты. Мэтай-жа нашай ёсьць: гуртаваць беларускія літаратурныя і навуковыя сілы, друкаваць іх творы і такім чынам прычыняцца да тварэньня беларускай культуры і пашыраць яе ў шырокія слаі нашага грамадзянства й народу. Робім-жа мы гэта, бо сьвята верым, што культура народу — найгалаўнейшая падстава лепшага ягонага заўтра.

Ідэовыя рамы „Калосься“ шырокія. Ёсьць у іх месца ўсім беларускім паэтам, пісьменьнікам, навукоўцам, крытыкам і інш., бяз розьніцы іх прарананьняў палітычных, соцыяльных і рэлігійных.

Усім ім наш часапіс ставіць толькі адну вымогу: каб творы іх былі магчыма ў поўнай згодзе з Праўдай, Дабром і Красой і, як такія, каб былі прыдатныя беларускай культуры і каб служылі шчасьцю беларускага народу.

Вот наша ідэовая дэкларацыя, вось нашы мэты, з якімі пачынаем нашу працу ў „Калосьсі“ ў другім годзе яго існаваньня.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

* * *

Мы — жывы маладняк песьняроў,
Песьню нашу стварылі мы самі,
Між расквечаных працай палёў. —
Тых, што вянуць, няма паміж намі!

Гэтай песьні юнацкія душы
Прысягалі дасьмертна служыць,
З гэтай песьняй паходам мы рушым
Сонцавеі у цемры тварыць.

Хай варожыць пагрозай і жахам,
І злуецца варожая моц, —
Нашы сілы — у творчым размаху,
Нам ня страшна ні цемра, ні ноч.

ЗВАНАР

Звані званар...
Звані трывогу.
У самы большы звон удар.
Звані на бой, на перамогу,
На радасьць новую, званар!

Навокал ноч...
І блудзяць людзі,
Шукаюць шлях даўно яны,
А хутка, хутка бура будзе;
Мацней — звані, звані, звані!

Паўзуць па небе страхі — хмары
І цені — дзіва па зямлі.
Устае далёка лунь пажара,
Крыжы хістацца пачалі.

Ты чуеш рэхі бур у далі,
Віхроў магутных грозны тон —
Хутчэй сыгнал давай на хвалі,
Удар у самы большы звон.

Звані — заві з сваей званіцы,
А то яшчэ праблудзяць век,
Ідзе, праз буры — навальніцаў,
Да нас запраўды — чалавек.

Звані — каб выйшлі на дарогу,
Яны, як трэ яго спаткаць.
Звані, званар! — звані трывогу!
Каб зноў вясну ім не праспаць.

5. I. 36 г.

* * *

Вецер, вецер, вецярок,
Замяцеліў, завірыў,
Замяцеліў пух — сьняжок
У нізу і у гары.

Серабрыцца пышна бель,
Мурам гурбы над акном,
Мякка сьцелецца пасьцель,
Завявае ўсё кругом.

Гэй, прачніся ты віхор!
І махні крылом сваім!
Падымі сьнягі да зор,
Над прасторам няжывым.

Прыдарожныя крыжы
І рагаткі на мяжы
Бураломам пакрышы,
Чысьціць шлях нам памажы.

Ён заломам, дзірваном
Праляжаў стагодзьдзі тут
І курган за курганом
Насыпаў працоўны люд.

Насыпалі не з сьнягоў;
Прынімала дар зямля;
Косьці белыя рабоў —
Гібель чорную ярма.

Дык віры сьнягі, віхор!
Чысьці шлях наш, буралом!
Мы выходзім на прастор,
Раськідаць вякоў залом.

Таболы, 5. І. 36 г.

З ЦЫКЛЮ „ПАДАРОЖЖА“ *)

I.

Люблю я раніцы вясною,
Люблю іх сьвежы халадок,
Зары румянай над зямлёю,
Агнём расквечаны вянок.

Падгледзіць, як туманіць рэчка,
Туман бялявы і густы,
І як з вятрамі ціха спрэчку
Вядуць лазовыя кусты.

Падслухаць, стаўшы дзесь
пры лесе,
Птушыны хор і шум лісьця
І думаць, што на гэтым сьвеце
Ў сям'і жывых — жывы і я.

Люблю касой выводзіць
строчкі,
Пракосаў стройных на лугу,
І сінявокім васілёчкам
Ківаць дзень добры!—на хаду.

Люблю я раніцай вясною,
Ў гаю падслухаць салаўя,
І ў млечна-белым цьветабою
Шукаць красу і чар жыцьця.

Вясна, вясна!.. і май прыгожы,
Вы ўжо праходзілі няраз,
Але у кожным падарожжы
Так многа чар красы у вас!

II.

Цягнік нясецца — далі, далі —
Наўстрэч: палі, лясы бягуць.
Ўставай-жа, муза, мы заспалі!
Трэ апяваць вандроўны пуць.

Настрой-жа ліру, муза, звонка
І голас выпрабуй, як трэ,
Мо' сьпеў наш гэты па
старонца
Вандроўны вецер разьнясе.

— — — — — — — — — —

Песьні! солад ваш і мукі
Пеняць радасьці і боль.
Я хачу пявучым гукам
Залаціць мазоль!

Люба шыр мне... Лес сьмяецца
Ціхім шолахам лісьця;
Людзі, людзі! й вашы сэрцы
Прагнуць радасьці жыцьця.

Ды на грэблю пералескаў
Цяжка выпаўзьці з нары,
Яшчэ змалку нашу сьцежку
Затапталі ведзьмары.

Ўсю тугу запром ў бяздоньня,—
Прэч ад вёсак нашых сум!
Усе мукі хай сягоньня
Глушаць сьпеўны шум.

Вецер — ты наш брат ван-
дроўны —
Памажы ўзмахнуць да зор,
Як і ты, і я — бяздомны
Пакахаў простор.

III.

Мігаюць за вакном вагона
Лагчыны, дрэвы і палі,
Прыбраў іх пышна май
зялёны
У шоўк рухомы і жывы.

---

*) Зьмяшчаем у гэтай кніжцы „Калосься“ палавіну твору, які належыць да цыклю „Падарожжа“; другая палавіна будзе надрукавана ў наступнай кніжцы часапісу. У гэтым творы пясьняр передае уражаньні з свайго побыту ў Вільні ў 1934 г., — і перадае іх у такім парадку хронолёгічным, у якім атрымліваў і перажываў. Твор, як чытачы пераканаюцца, мае вялікую эмоцыянальную сілу, насычаны высока ідэёвым зьместам, — зьмяшчае шмат важных і палючых праблемаў социяльнага, нацыянальнага і агульна-людзкага характару, а такжа мае вартасьці артыстычныя.

Рэдакцыя.

Мінаем вось касца ў балоце,
(Занадта рана вышаў, брат),
А ён расхрыстаны і босы
Навіў пракосаў цэлы рад.

Далей вось пасьба... і кароўкі
Скубуць травіцу смачна так,
А тут пясчаныя ўзгоркі
І каля вёскі — млын-вятрак.

Махае пёрамі ляніва,
Як птушка зломаным скрылом.
(Яму таксама не да мліва,
Калі вясна цьвіце кругом).

І абразы за абразамі —
Узорна-ткана палатно, —
Лясы, гаі, руччы, з палямі
Прывет свой шлюць мне праз
вакно.

О май! чароўны і вясёлы,
Вясны і сонца — дзіцянё,
Люблю твой чар і шум зялёны,
Табой шумячае жыцьцё.

IV.

Ўжо блізка Вільня — горы,
горы,
Пакрыты густа хвайнікам;
Адна з аднэй, як хвалі ў моры,
Бягуць, каб стрэцца з цягнікам.

А між гарамі хаты-цацкі,
Вузкія вулкі і муры,
Якбы з прыгожай нейкай казкі
Абраз, узяты кімсь сюды.

Па вузкіх сьцежках і дарожках,
Куды ні глянь, — што тых
людзей!
І пільна кратаецца кожны
Хутчэй пачаць свой новы дзень.

Чуваць настрой і пульс
мястовы
Такі рухлівы і жывы,
Зусім адменны ад палёвай
Задумы ў шолаху травы.

Сачу скваплівымі вачамі
За схілам кожнае гары
І бачу — ў далі, між гарамі,
Растуць фабрычныя муры;

І каміны ў вышы над імі —
Плюець у неба хмарай дым,
І чую, ў сэрцы б'е прылівам
Размах юнацкі і уздым.

V.

Прадмесьце — хаты, хаты...
Гароды, клюмбы і кусты
Прыбраў зялёны май багаты
І бельлю ўсьпеніў ўсе сады.

Сьвісток! Цягучы і глыбокі
Ўзадуму-ціш маўклівых гор.
Вітае нас чырвоным вокам
Ўгару падняты сэмафор.

І замільгалі камяніцы,
Касьцёлы, вежы і муры,
Гара Замковая са шпіцам
І гістарычных тры крыжы.

За вулкай вуліца праходзіць
З вясновай раніцай на бруку,
І коскі сонца ў карагодзе
Танцуюць ў скочным рытме
руху.

VI.

Ласкот гамульцаў па калёсах...
І стаў задыхаўшысь цягнік.
Яшчэ раз, Вільня, давялося
Таптаць нагамі твой хаднік.

Уходжу ў вір жывы, кіпучы,
Ў натоўп людзей, паміж валіз,
І зліўшысь ўсе рухомай кучай
Плывём ў тунэль па сходах
ўніз.

Гудзіць тунэль адзвонным
рэхам —
І шум, і гом, і срыбны сьмех;
Бубняць шагі ў пасьпешным
бегу, —
Ідзём ізноў па сходах ўверх.

VII.

А вось і брук твой шэры, Вільня,
Асфальты, цэмэнт і муры...
Узор раклямы каляровай,
І шум, і гул, і рух жывы.

Таксоўка ластаўкай па бруку
Снуе з прахода у праход;
А вазьнікі стаяць бяз руху:
Чакаюць сумна на чарод.

І людзі йдуць, праходзяць міма,
Усе з павагай, як адзін.
І зьяе сонца пералівам
У люстрах вокан і вітрын.

Я — сын бязьмежных даляў
поля,
Вясковай цішы і задум
Іду да места, у няволю,
Лавіць яго рытмічны шум.

VIII,

О, Вільня, ты для нас ня матка!
І мы як пасынкамі тут:
З тваіх муроў — палацаў
гладкіх
Займаем мы апошні кут.

І хоць мы кутнікі у хаце,
З якіх сьмяецца гаспадар,
Але тут маем шмат багацьця
І Зьніча нашага аўтар.

І ты сама з мінулай процьмы,
Ты помніш нас, беларусоў:
Каменнымі сваімі вочмі,
Глядзіш на нас з сівых часоў!

Мы ня прышлі сюды з-за мора,
Твой воўк жалезны з нашых
пушчаў
Забрыў прарочыць гэтым
горам, —
Што ты тут вырасьцеш
магучай.

Цябе карміла наша поле,
І будавалі мазалі.
Ўсе нашы радасьці і болі
Калісь супольнымі былі...

Цяпер ты іншай стала, іншай,
Глядзіш на нас, як на прыблуд.
Мы непатрэбнаю і лішняй
„Mniejszością“ сталі табе тут.

Але ці хочаш, ці ня хочаш,
Ці як глядзі, ці не глядзі, —
Яшчэ пабачаць твае вочы,
Як будзем тут і мы людзьмі.

Прыліў сялянскі із-за гораў
Ў твае муры прыбоем б'е...
О, Вільня! мы яшчэ паспорым,
Няраз — з табой і за цябе.

IX.

Хачу спагнацца з рытмам
места,
Шагі прысьпешаны мае.
О, людзі! як вам тут ня цесна,
Ў мурох... і няжывой красе?

Каменныя карыты вуліц
Мігцяць прачнуўшыся
жыцьцём.
Каштан да муру ціха туліць
Зялёны дах над хаднікам

І ўсё ў цьвяту... Каштан
і вішня
Ў задуме белай пры муры
Здаецца мне — прыкрасай
лішняй,
Як заблудзіўшысь тут яны.

Там, дзе муры з жалезам
дружаць,
Дзе дым, ляскот і гул машын,
Там ня жыве, а цяжка служыць
Прастораў вольных, вольны
сын.

І хочыцца сказаць мне гэтым
Каштанам, вішням і людзям,
Засьмягшым тут на бруку
летам: —
Ідзіце ў поле, — воля там!

X.

Іду далей... вось Вострa-брама.
Зьнімаю шапку (трэба тут).
Малітвай раньняю сабраны
Каля муроў таўпіцца люд.

— — — — — — — — —

Я не малюсь мурам і тайнам
Незразумелым і пустым.
Мой Бог — такі прасты,
звычайны,
Але магутны і жывы.

Яго аўтар — лясы і поле,
Яго сялібай — даль і шыр,
І гай зялёны на прывольлі
Шуміць імшой, як манастыр.

І я малюсь Яму з калосьсем,
І я малюсь Яму з травой,
І ў веснашумаў адгалосьсі
Гуторыць часта Ён са мной.

XI.

А вось старыя Базыльяны, —
Царква й вядомыя муры —
З сьвятою надпісьсю над
брамай
І ў ей абраз якісь стары.

За брамай ціш... Настрой
вясьняны...
Схіліліcь дрэвы над муром.
Дуронік-вецер расьпяны
Шуміць, пaспорыўшы
з лісьцём.

А на крыжох царквы—вароны
Спраўляюць раньнюю імшу.
І са сьцяны Хрыстос ста-
млёны
Глядзіць пытаньнем мне
ў душу.

О Ты, Вялікі і Магучы,
Ня грэшны я перад зямлёй!
З жывых нікога я ня мучыў
І гэты цяжкі боль пявучы
Вылучна — мой.

Ня быў ніколі я багатым,
Асобай важнаю ня быў,
Пяяў аб тых, што ходзяць
ў латах
Паміж прыгожа пышных ніў.

І ня судзіў, як Ты, нікога,
Прымаў усё і выбачаў.
Ў грудзёх людзей шукаў я
І праўды тэй, [Бога
Што на крыжы Ты паказаў.

XII.

Саджусь на лаўцы каля муру,
Кармлю душу спакоем дрэў,
А за мурамі ў даль разгулам
Нясецца места шумны веў.

Спляліся штучныя дарожкі
У засень дрэў, каля царквы.
Пясочак жоўценькі, прыгожы,
А на пяску чыесь сьляды.

Каліcь хадзіў па гэтых
сьцежках
З душой бунтуючай адзін —
Адам Міцкевіч — волат вешчы
Палёў тваіх, о Вільня, сын.

Пяяў тут гімны „прамяністым“
І оды вечна маладым.
Задумай топаль срыбналісты
Шумеў, схіліўшыся над ім.

І вы — старыя Базыльяны —
Яму вязьніцаю былі,
І дух натхнённа-расьпяны
Гасілі краты і муры.

XIII.

Цяпер тут ходзяць гімназісты,
Сыны мужыцкае сям'і;
І на пясочку гэтым чыстым —
То пэўна іх відаць сьляды.

Усьцяж іх болей; з кожным
годам
Ідзе з палёў прыліў сюды:

Надзея прышлая народу, —
Мы верым ім ужо згары.

Хоць будзе з іх і рэнэгатаў
І здраднік пэўна не адзін,
Але ў сям'і жыве й гарбаты,
А ў маці ён — нат любы сын.

Цяпер іх дух кіпуч і сьветлы
І сэрца чыста, як крыштал.
Шукаюць: сэнс, дарог і мэты,
Ва ўсім і ўсюды — ідэал.

І ўсё-ж на іх надзея наша,
На перамогу ў барацьбе:
Ўсіх душ ня струціць жадна
каша,
Бо згіне — зломак і слабы.

XIV.

Хутчэй-жа зьмена маладая,
Вучысь, гартуйся і расьці!
Вас праца цяжкая чакае, —
Трэ пад крыжом да мэты
йсьці.

Ў старым балоце многа гнілі,
І бруд, і плесьня завялась.
Расьціце моцнымі: —
На вашы сілы
Братоў надзея засталась.

Мацнейце, юныя,
Душой і целам! —
Вам будаваць прыдзецца
новы дом,
А гэты наш бяз часу згніў...
І спарахнелы — пайдзе
на злом.

XV.

Але, Міхась, — няхай!..
Што будзе — тое будзе...
І не твая віна у тым:
З табой мы — маленькія людзі,
Прарочыць сьцежку маладым.

Яны знайдуць дарогу самі,
І зьмест і форму прынясуць,
І песьню новую
Над новымі палямі —
Гучней ад нашай запяюць.

Ты-ж толькі вёскі лірнік ціхі,
Цябе нат ў месьце не пяюць,
Судзіць ня важся тых вялікіх,
Што верхаводзяць і...
„жывуць".

Давай лепш рушым мы з пад
муру,
Бо тут да грэху надта блізка,
Бо тут падняць мы можам
буру:
Бо кожны цэніць ў час наш
хмуры
Сваё карыта, або міску.

XVI.

—Музэй Луцкевіча Івана —
Чытаю надпіс на дзьвярох,—
Жалезам дзьверы акаваны
І ганак крыты у мурох.

Званю...
Мне адчыняе дзьверы тыя
Наш—знаны крытык—Навіна
(Ня бойся, муза, мы — малыя:
Малых — малая-ж і віна).

І прывітаўшысь з дзядзькам
ветла,
Ідзём гуторачы далей.
Ў душы і радасна і сьветла
(Уходжу першы раз ў музэй).

Бібліатэка... Колькі кніжак!
Малых, вялікіх і таўстых.
Пяшчу рукой; падхожу
бліжай —
Ўсё гэта мудрасьць дзён
старых,

Сьляды мінуўшчыны багатай,
І дум, і творчасьці дзядоў;
Жыцьцё і быт — ад шэрай
хаты,
Да пышных княжацкіх муроў.

Ўсё аб Табе — мой Край
каханы!
У кожнай кнізе і радку
Багацьці дум і звон баянаў
Ляжаць сабраныя ў кутку.

XVII.

Пакой другі... На першым
пляне,
На столе лапці і гаршкі
(Хаця і сёньнека сяляне,
Яшчэ ад лапцяў не ўцяклі).

Там на сьцяне дуда, цымбалы,
Спакойна ціхімі вісяць;
Іх час прайшоў,
І сэрцаў сьмелых і удалых
Яны ўжо больш не весяляць.

Каля сьцяны у рад фігуры,
У рознай постаці, Хрыста:
Сваю душу і лёс пануры
У іх адбіў народ-мастак.

А на стале, з гаршкамі радам,
За тапаркамі—там пад край—
Ляжаць вясельныя прылады
І быццам з печы „каравай“.

Супроць сьцяна зьмясьціла
зброю
Тых слаўных рыцарскіх
часоў,
Калі Пагонь была жывою
Ў дружыне вольных Крывічоў.

XVIII.

Далей пакой... Зусім другое:
Статут Літоўскі, абразы,
І ў шафцы шклянай пад
сьцяною
Вісяць Слуцкія паясы;

Князеў пярсьцёнкі і манэты
І шаты тканы серабром;
Ля іх—здаецца майго дзеда—
Сівая сьвітка, пад акном.

А вось і Твой куток, Іване!
Твой бюст, партрэты на сьцяне
Знайшлі ціхое тут пры-
станьне —
Тут часьць душы Тваей жыве.

— — — — — — — — —

XIX.

Іван, Іван! — Сяйбіт наш
слаўны!
Яна прачнулася — жыве,
Зярняты сеяў ты нядарма,
Ня марны мукі ўсе Твае!

Зярняты дум Тваіх і дзеяў,
Што так ахвярна сеяў Ты,
Сягоньня пышна зарунелі
Усходам радасным, жывым.

Хоць там далёка, ў „Zako-
panem“
Сумуе Твой магільны крыж,—
Дзе Ты, наш слаўны і каханы,
Адзін пакінуты ляжыш.

Прывет Табе! — Прывет —
Краіны
Табой ўзварушанай, жывой,
Ад вёсак, ніў і даляў сініх,
Ад ўсіх разбуджаных Табой.

Я знаю, Ты там тужыш, тужыш,
Між дзікіх гор чужой зямлі:
Як сонца чырваньню і ружам
Зальле магілак камяні, —

І сьніцца Край усьцяж прыгожы
Гэнь там, туды—за гор граніт,
Дзе столькі вытаптаў дарожак
Ты, вартаўнічы і сяйбіт.

— — — — — — — — —

XX.

Іван, Іван, Сяйбіт вялікі!
Прынёс Табе паклон я свой!
Адзін я з тых, якіх Ты клікаў,
Адзін з адроджаных Табой.

Ля абраза Твайго з пашанай
Стаю ў музэі Тваім тут.
Наш гэты скарб, Табой
сабраны—
Сьляды і славы і пакут.

Рэзьбіў Ты ўпорна і трывала
Абраз магутнасьці яе
І мукай творчай сумавала
Твая душа. — Ці аджыве? —

Спакойным будзь, о Дух Вялікі,
Ня згасім мы Твой творчы
зьніч, —
Нядарма Ты будзіў і клікаў:
Яна жыве — і будзе жыць!

XXI.

Бывай музэй! мне трэба далей,
Бывай Іван і Навіна!
Удзячны я, што паказалі
Мне, як калісь жыла Яна.

Цяпер пайду глядзець другую,
Сачыць сьляды ў віры жыцьця.
Шукаць прачнуўшыся —
жывую,
З пад заняпаду — нябыцьця.

Іду па вуліцах. Нанова
Зьвіняць асфальты пад нагой;
Як тая хваль да даляў новых
Плыву і я ў таўпе — з таўпой.

Куды, куды ты варушысься,
Ручэй нястрымана-жывы?
Праз дзень, праз два, як
ня імкніся —
Дагоніць нас чарвяк малы.

І непатрэбнымі уляжыць
Ў грудзёх: і радасьць і мана,
І як тады камусь адкажам,
Чаго прыходзілі сюда.

XXII.

Вось растаран — „Зялёны
Штраль",
Каля сталоў „эліта" ўся.
Яны так пэўны, што пазналі
І сэнс і радасьці жыцьця.

Вакно адчынена... Я бачу
Тлустых аголеных жанчын.
Няшчыры сьмех... Джаз-банд
зьвінячы...
З юрлівым рогатам мужчын.

І заля пышна так прыбрана:
Каўры, крыштал і серабро...
А колькі красак растаптаных
Тут уміраe, — пад сталом!

Ля вокан з вуліцы таўпіцца
Таўпа працоўная людзей:
Глядзяць, — як можны
І дзеці тут — [весяліцца;
Ах, адвядзіце-ж хоць дзяцей!

XXIII.

Скачы, скачы незразумелы,
Стары распусна-брудны сьвет!
Ты не паймеш узмах наш
сьмелы,
Да новых сьветазарных мэт.

Ты глух на енкі і праклёны
Ў нядолі гінучых братоў,
Ты глух, — ня чуеш, як хтось
звоніць: —
На суд апошні будзь гатоў!

Свой розум выліўшы
ў распусту
І сэрца кінуўшы на брук,
Распрастытучаны і клусты —
Ты не паймеш — ні нашай ра-
дасьці, ні мук.

А наш сьвятляны шлях ідэі
Табе і сьмешан і няміл:
Жывеш бяз веры і надзеі;
Паўзі далей! Паўзі — чарвяк —
бяз крыл.

XXIV.

Скачы над прорваю вулкана,
Хоць там дыміцца дынаміт...

Ды што табе? калі ты п'яны,
Распрастытучаны і сыт.

Няхай ў сырых падвалах гінуць,
Як краскі, — дзеці беднякоў.
Варштатаў вашых не спакіне
Цяжкая праца іх бацькоў.

Бярыце цела на пацеху,
Далей іх матак і сясьцёр,
Чым болей крыўд, чым болей
грэху, —
Хутчэй ваш суд і прыгавор.

XXV.

Міхась, Міхась! мне надта
сьмешна,
Што ты пачаў карыць другіх.

Даўно вядома: сьвет наш
грэшны,
І гнільлю пахне сьвет сытых.

Яшчэ здаўна у браце брата
Казаў нам бачыць добры Бог,
Але за пузам—сьвет багатых
Ня бачыць нават ўласных ног.

Сягоньня хай жывуць панамі;
Няхай гуляюць і пяюць:
Яны асуджаны ня намі
І хутка, хутка дагніюць.

І нам з табою проста сорам
Шукаць сумленьня ў сэрцы
тым,
Якое век было сьцюдзёным
І нат радзілася пустым...

(*Працяг будзе*).

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

МЕСЯЧНАЙ НОЧАЙ

Ноч срыбным пальцам ціха водзіць
Па стройных пнях готыцкіх вежаў
І топіць фрэскі ў белым лёдзе
І вокны блескам белым рэжа...

. . . .

Стаю ў туманным срыбры ночы...
За мною горад празаічны,
Няўпынны горад плюшчыць вочы —
Кругі лятарняў электрычных,

Цяжарам кол жалезных крышыць
Сьлізкі асфальт, дзікія брукі,
І сьніць аб месяцы і цішы
Пад хрыплы хор мястовых гукаў...

Галосіць радыё ў кавярні,
Нястройна енчаць кляксафоны,
Міргаюць жоўтыя лятарні,
Мігціць рэклямаў пыл чырвоны.

У нэоновым трупім блеску
Плывуць сыльвэткі самаходаў, —
Ў глухіх завулкаў пералесках
Шукаюць дробнае прыгоды.

. . . .

А ноч... Ноч срэбным пальцам водзіць
Па стройных пнях готыцкіх вежаў,
Ноч топіць фрэскі ў белым лёдзе,
Й вітражы блескам белым рэжа.

Ноч цягне месячныя тоні,
Сплятае зьзяньні ў мост узьлётны,
Каб завясьці ў нябёс бяздоньні
Натхнённа выцягнуты готык...

Хэлмна, 1935.

ВЕЧАР ЗІМОВЫ

Ціха... Між клёнаў бязьлістых
Сьцелецца змрок надвячорны.
Месяц халодны і чысты
Выплыў на небе бяззорным.

Сьцішаны сьпевам мяцелі
Дзень дапаліўся вятраны,
Сінімі робяцца белі
Даляў чужых і нязнаных.

Сумна... Дадзе́ла праменнасьць
Льдзістых зімовых заходаў,
Хочацца нейкай адмены,
Неперажытых прыгодаў.

Хочацца летніх палудняў
Палкасьці й золата іваў,
Звону чмялёў-перагудняў,
Сьмелых, гарачых парываў.

Трудна... Між клёнаў бязлістых
Дзень дапаліўся зімовы
Й месяц халодны і чысты
Выплыў на небе лілёвым.

А. БЯРОЗКА

* * *

Адзінота...
Глухая...
Неба ў тумане шэрым,
Шэрае поле і стрэхі хат,
Шэрыя думкі туга навявае...
Глуш... Цішыня...
Доўгія цені кладуцца на сумных палёх...
Вечарэе...
Цені кладуцца на думках і тушаць надзеі.
Ў сэрца бяз веры
Ім адчыніла туга-адзінота шырокія дзьверы.
Вецер злуецца за вокнамі, дзіка рагоча, як кат,
З бедных, пахіленых стрэх рве пачарнелы мох...

Вецер гуляе...
                    вецер шалее...
Маўчыць туга — адзінота...
І я маўчу і чакаю...
Можа зноў зварухнуцца у глыбях душы залатыя надзеі?
Можа блескі апошнія дня
Яшчэ блескаў апошніх у сэрцы ня стушаць?
Можа веры ня здушыць
Глуш—туга адзінота?
Можа голас якісьці ажывіць сьмяротную ціш? Мо хоць
                                        [скрыпнуць вароты?
Ў небе зорка мо' блісьне з-за хмар хоць адна?
Але глуш ўкруг пануе і цемра бяз дна...
Адзінота...
А там... з цемры ўстае здань-зладзейка
І паўзе па сьцяне; злудай нейкай
Свае доўгія пальцы снуе па кутах...
І на сэрца трывожнае падае страх.
Хто ты, мара праклятая? Хто ты?
Цемра ўкруг... Цішыня... Адзінота...

З І М А

І прышла яна... Шчодра сьнягі разаслала
І павісла на вецьці жальлівых бяроз
Белай наквецьцю... Шклянаю нізкаю сьлёз
Маразяных на землю апала...

А вакно маё сівы мароз акаваў
У халодныя, срэбна-іскрыстыя ковы...
Сівер злосна дыхнуў завірухай зімовай...
Хмары неба туманяць, моў плоймы зьяў...

А калі загуляе на полі завея
І заплача, застогне сьцюдзёны віхор —
Ўскалыхнецца, як волат, асьнежаны бор,
Ўстане шум з яго нетраў, расьце, магутнее,
Бястрывожна ідзе, каб сустрэнуцца з бурай
І віхры праламаць, сум разьвеяць пануры.

29. XII. 1935.

Я. ПАЧОПКА

МЯЦЕЛІЦА

Улеглася мяцель, —
Не варушыцца.
Разаслалась пасьцель
Ды харошыцца.
Што вун горы ляжаць —
Бел-падушачкі,
На іх сьвечкі гараць,
Як ў задушачкі.
З-за гары маладзік
Падымаецца;
Падняў вочы, прынік —
Углядаецца.

Ні ў гару, ні у ніз
Не парушыцца;
Узыйшоў і павіс, —
Усё любуецца.
Тяк і знаць, па ўсяму
Адбіваецца,
Што занадта яму
Падабаецца.
Гэты пух, гэта бель,
Што так сьвеціцца,
А найбольш ты, мяцель,
Размяцеліца!

В. АДВАЖНЫ

ЧУШКІ

Я відзеў раз такіх... сьвіней —
(Ня буду раўнаваць іх да людзей!).
Яны ўсё елі — спалі,
Нічога больш ня зналі;
І елі так бяз меры, елі, елі!...
І спалі ад нядзелі да нядзелі.
А елі смачна, ласа,
Бо... гадаваліся на мяса.

Я гэтай басьні ня буду нат тлумачыць,
Бо, хто захоча, сэнс убачыць.

КРУЧОК

Маленька рыбка з бацькам, з маткай
Пайшла шукаць сьняданьня: —
Дый на вадзе ціхой і гладкай
Дарэмна паляваньне!
— Ах, мама, мама — чарвячок! —
Крычыць маленька рыбка,
І стала гнацца за ім шыбка.
— Дурненька ты, ня руш, бо там кручок.
Другая справа — вось чарвяк! —
Сказала маці, зачапіўшыся за гак.

Бываюць і старыя
Лакомы, як малыя.

АНТОН ХМУРНЫ

З нядр. пов. „Юры Рушчыц".

У пушчы

...Гэ, Рачыцкі! Хачу пра яго табе расказаць, сынку. Дык і ты, маці, калі спаць не ахвота, паслухай.

Скуль дзед ягоны тут браўся, — напэўна ня знаю. Старыя людзі казалі, што і ён з Меншчыны родам паходзіў і што панаваў на вялікіх абшарах. І звалі яго не Рачыцкім, як цяпер унука, а проста Рачком, дый яшче Аднарукім. Да прыгонных людзей быў Аднарукі Рачок, як зьвер люты. Ня толькі па ягонаму загаду катавалі прыгонных людзей цівуны, але й ён сам пацеху меў мучыць і катаваць людзей так, што не адзін пасьле душой загавеў. Сілу меў, як мядзьведзь, і хадзіў ён паляваць у пушчу адзін і не баяўся зьвяроў, якіх поўна было. Раз у пушчы сустрэў ён чалавека, што з рагацьцём і сякерай ішоў, як і ён, паляваць на зьвярыну.

— А ты хто і адкуль? — запытаўся Рачок, — як сьмееш паляваць тут без дазволу? Мо' ня ведаеш, што я тут гаспадар, а ніхто іншы? Дык зьдзяру зара скуру з цябе!

— Паспрабуй — адказаў чалавек.

— Як ты сьмееш грaзіць! А-а, ты-ж Сьцяпан, што ўцёк з двара... Я аблаву загадаў ужо зрабіць на цябе, дык вось, папаўся ты сам да мяне!

— Не чапай, не падходзь, бо вось гэтым ражном распару чэрава табе! Хоць ты й пан, але ня тут, бо ў гэтай пушчы і я пан і што упалюю, дык будзе маё. Гэтага лесу ты не садзіў. Бог пасадзіў яго на карыстаньне для ўсіх. Хацеў ты замучыць мяне ў двары, дык змусіў схавацца ў гэтай пушчы. Не зачэпіш мяне — не крану й я цябе. Дык выбірай: або разойдземся кожны ў свой бок, або на сьмерць будзема біцца? — спытаўся Сьцяпан.

— Дык ты, хам, мне грaзіш, а ня кінуўся цалаваць маіх ног, каб табе даравў я правіны! Дык вось мігам зраблю з табою расправу!

І кінуўся ён, як той зьвер, на Сьцяпана. Але й Сьцяпан ня быў слабунок, а ламаў для забаўкі падковы. І, схапіўшы за грудзі Рачка, так яго стармаснуў, што той паваліўся.

Годзе ці не? — спытаўся Сьцяпан. Здаецца відаць, што я дужэйшы за цябе і цяпер, нябось, ня маеш ахвоты брацца са мною ўходкі?

— Маю, хам! — крыкнуў Рачок і махнуў сякерай у Сьцяпана.

— Ах, калі так, дык давай!

І схапіўшы сякеру наляту, адным махам адсек правую руку Рачка аж па локаць.

— Цяпер ідзі, душагубнік і гад. Рабі аблавы, палюй на мяне, як на зьвярыну дзікую. Ідзі і скажы, што Сьцяпан табе

руку адсек за крыўду ня толькі сваю, але й за крыўды і сьлёзы другіх. Калі-ж будзеш на мяне аблавы рабіць, дык з агнём пушчу тваё гадаўскае гняздо і сам ты ў ім згінеш.

Рачок Аднарукі — як пачалі зваць яго з гэнага часу — ня спыняў аблаў на беднага Сьцяпана. Але і Сьцяпан стрымаў словы. У адну цёмную восенскую ноч падпаліў палац, у якім ледзь не згарэў Аднарукі, а сам ізноў у пушчу схаваўся.

Гутарылі старэйшыя, што доўга ў пушчы ён жыў, а посьле некуды зьнік...

ЯЗ. БУРАК

У парку

У старым парку на іх лаўцы чакаў яе. Ціхай, ёй толькі ведамай, паходкай па ледзь скрыпучым жвіры алеі прышла яна і села побач моцна тулячыся да яго. Яны кахаліся і ўкладалі пляны на будучыню.

Ён сказаў:

— Учора была прыгожая ноч і я доўга думаў аб табе. Ты шмат сьветлых мысьляў уліла ў душу маю і запаліла перадамною бліскучыя імкненьні шчасьця. Цяпер я ведаю, што калі адыдзеш ты — адыдзе ад мяне супакой дзён і жыцьцё маё будзе пустое. Але сяньня шчасьлівы я, што ты пры мне. Ты маеш добрую душу і прыгожыя вочы. Урэшце я кахаю цябе.

Цёпла блішчэлі яе вочы. Сьвяціў месяц і зьдзіўлена дрыжэла пурпура вуснаў:

— Я не пакіну цябе. Як цень буду хадзіць за табою, буду жыць тваім жыцьцём і думаць тваімі катэгорыямі. —

Ціха шапталіся ліпы. У шуме іх рэфлексам сьмелае імагінацыі высноўвалі міражы шчасьця, блыталі пралётныя ўражаньні рэальнасьці ланцугамі адзіночна аформленых пачуцьцяў. Сілай хвараблівага ўзлёту, у аднабаковым захопленьні, занятыя толькі сабою, шапталі акружаючыя зьявы. У прыплыве ўзбураных уражаньняў сьлядзілі за адбітымі ў вачох праблыскамі праснуўшае ідэалізацыі і луналі ў мрыях сумеснае будучыні. У кустох пяяў салавей.

Але раптам лёгкая імгла прыкрыла яго вочы, калі ён казаў:

— Чаму ты прышла? Мы ня можам быць разам, бо мова наша розная, як розная была мова нашых бацькоў. Ты ня знаеш майго народу, ня ведаеш яго трагэдыі. Але я не хачу, каб сын мой быў чужым мне, каб каменьнем ненавісьці кінуў у бацьку. Я ня маю права на гэта перад маім народам і ўласным сумленьнем.

Але яна маўчала. Толькі вочы яе ламалі нявідавочныя праменьні жалю і ціха туліліся дрыжачыя вусны. Магчыма яна плакала.

* * *

Прайшло шмат гадоў. Зноў спаткаліся яны. Роднай яму мовай адазвалася яна і голас яе быў звонкі і мілагучны.

— Я шчасьліва, што мы зноў спатыкаемся тут, — казала яна. І раскошна сьмяяліся яе вочы.

— Твой голас стаўся мілы і вочы зрабіліся больш сінімі. Чым вытлумачыш ты гэта? — спытаў ён.

— Я пазнала тваю мову, а вочы ўцягнулі глыбіню неба ў тваім краі. Памятаеш, як апошні раз былі мы тут разам? Я не магла забыцца цябе і тваё словы заўсёды гучэлі ўва мне. А ў краі тваім цьвілі белыя акацыі і босы дзяцюк гонячы каровы сумна іграў на жалейцы. Увечары-ж зьбіраліся дзеўкі на прызьбе і пяялі песьні аб дзяўчыне, каторая кінулася ў раку. Заўсёды здалёк слухала я іх і тады сэрца на кускі рвала туга па табе. Я ня ведала, калі мы спаткаемся зноў.

Ступнёва штораз больш цішэў яе голас, пераходзячы ў нейкі нявыразны шэпт. Ціха кідалі словы дрыжачыя вусны і нешта пакорна прасілі вочы. Гледзячы ў твар яе, на каторым ня было ўжо румянцаў дзявочае моладасьці, ён сказаў:

— Я заўсёды верыў у цябе і мучыўся з адсутнасьці тваё ў сваім жыцьці. Цэлымі днямі я пабываў у тых мясцох, гдзе былі мы разам, каб уваскрасіць духа прайшоўшых форм. Я засынаў і прабуджаўся з думкаю аб табе, а тугу сваю зрабіў галоўным элемэнтам дня — аўтаром, пры каторым да ўспамінаў аб табе маліўся я. Я ня ведаў, ці спаткаемся мы зноў. Але цяпер, калі шчасьлівы лёс зноў злучыў нашы дарогі, нічога ўжо не павінна разлучыць нас.

З нсваўваскросшым захопленьнем, з частак хаотычных успамінаў укладалі прычудлівыя ўзоры ўзьнятых пачуцьцяў. Адвагай сьмелага прызнаньня праз прызмы вачэй пранікалі ў капітулюючыя тайнікі душы і яркім уздымам плавіліся ў атмосфэры суадносін. Наступаючы вечар прыносіў новыя задаткі чару. Таемным рухам уехаўшы на быстраногім Пэгасе ён запаліў вагні вялікага возу і ў ліству дрэў кінуў адзіноку Вэнэру.

Ціха сьлядзілі за ігрой апошніх вібруючых акордаў уступаючага дня і з пашанай няпэўнасьці будучых хвілін перад усемагутна абымаючай сучаснасьцю глядзелі ў вочы наступаючых ценяў.

Тады ён сказаў:

— Нашто ты прышла? Мы ня можам быць разам, бо думкі нашы ходзяць іншымі дарогамі. Ты ня ведаеш душы народу, мову каторага пазнала цяпер. Ты ня вышла напроціў і не падала яму рукі, але здалёк захаплівалася словам яго, як мэцэнас мастацтва захапліваецца палатном няведамага мастака. Ты ніколі не палюбіш яго, бо ніколі не зразумееш усіх тайнікаў ягонай душы. Ці разумееш ты гэта?

Але яна маўчала. Пасьля сьхіліўшы галаву яна адышла няроўна ціхай, ёй толькі ведамай, паходкай. Аднак яна, як і даўней, кахала яго.

* * *

І трэці раз спаткаліся яны. Постаць яго згорбілася і белыя ніці прабіваліся ў валасох. Яна, як і ўсе сёстры яе, была заўсёды маладой. Пабялелі толькі яе валасы.

Што сталася з тваімі валасамі, — яны цяпер сівыя, — сказаў ён.

— Я пазнала тое жыцьцё, аб каторым ня ведала раней, — казалі яе страціўшыя свой прыгожы колер вусны. — У душных цёмных норах раскінутых на вузкіх палосках зямлі жывуць сваім жыцьцём шэрыя людзі.

— І што ты бачыла ў іх?

— Жнучы жыта, жанкі пяялі працяжныя песьні і цешыліся, што заўтра будуць пячы хлеб. А зімой малы хлопчык пытаўся маці: — Чаму мы ня маем хлеба? — і вочы яго рабіліся бліскучасумнымі. Малы дзівіўся, за што б'юць яго, — ён-жа не хацеў месяца з неба, як хочуць часта малыя дзеці. Дзяўчына-ж мела нявінныя сінія вочы і кахала хлапца з шырокімі плячыма і тварам дзіцяці. Але прышоў чужы чалавек і яна як цень пайшла за ім. Золатам раскідаўся ён, а дзяўчына мела прыгожыя, нявінныя вочы і была галоднай. Моўчкі хадзіў хлапец з шырокімі плячыма і тварам дзіцяці.

Інтуіцыйна ціха тулілася да яго. Роўнамерна ціхі, як плач разьвеяных некалісь лятуценьняў, праз бледныя вусны выплываў яе шэпт:

— Я пакахала гэты народ, як кахаю цябе. Я пазнала ўжо тыя граніцы, каторыя аддзялялі нас. Пойдзем разам у жыцьцё і для шчасьця іх аддамо свае сілы!

Але ён запытаў:

— Ці маеш ты другое жыцьцё?

Яна-ж маўчала, сочучы за ценямі, якія моўчкі клаліся пры дарозе...

* * *

Падалі асеньнія лісьці, а з цёмнага неба зьдзіўлена глядзеў іронічны дыск месяца.

Магчыма, ён ня быў прыхільнікам тэорыі расы.

Беласток, 1934.

МІХАСЬ ВАСІЛЁК

ДАРОГАЙ З ВІЛЬНІ

Глухім лясочкам сярод ночы
Бадзёрны, сьвежы зноў іду я —
І сэрца цяжару ня чуе,
Сьнег сыпле зорамі мне ў вочы.

Іскрыцца, сьцелецца пад ногі,
Вакол ціша, ціша нямая —
Сьмяецца месячык двурогі,
З чупрынай белай ель густая
Гальлём тут зьвісла над дарогай.

Гукнуць-бы так здаецца — гэй!
Заліцца песьняй весялухай,
Каб буйнасьць выліўшы з грудзей —
Ўсё сонна-сьпячае разрухаць...

— Паўстаньце вы, чый лёс благі, —
Душой вас клічу на параду: —
Пасевы бура нішчыць градам,
Цярпеньне лье праз берагі...

— На ўсходзе ўжо разьліў хтосьць медзь —
Віхрыста думка ў даль бяжыць...
Агонь ў грудзёх — я тым агнём
Шалёна прагну сьвет пагрэць...
А навакол — крыжы, крыжы...

Крыжы, браты, і кроў пад крыжам...
Як чорны кот падкраўшысь ціха,
Яе цень ночы моўчкі ліжа, —
Над ёй скавыча дзіка віхар!

Іду. А вось і вёска родна,
Што у віры жыцьцёвых зьмен
Дала мне столькі праўд нягодных
І мала радасьці ўзамен...

За мой пагляд, мае імкненьні —
Інтрыгай, плёткамі, пад час
Мне цені з чорных сутарэньняў
Душу аплёўвалі ня раз!

Баброўня, 1936 г.

А. ЧЭМЕР

З повесьці:

Старое і новае

...Весела скача сіні аганёк па дагараючых вуглёх! За вакном — марозная, месячная ноч.

Ганка задумлена ўглядаецца ў жывыя, рухавыя аганькі. Прыемная ўтома схіляе на падушку яе голаў, клеіць вялікія, прыгожыя вочы... Вышыўка ападае на калені, мімаволі зачыняюцца павекі...

З лёгкім скрыпам адчыняюцца дзьверы. Клубы пары сьцелюцца па падлозе... Уваходзіць мілы, стройны і магутны, высьнены ў адзінокіх дзявочых снах, у доўгіх бязсонных начах...

Пэўнаю рукою прыгартае яе да сябе, як пярынку саджае ў санях і цераз хвіліну мчацца па іскрыстым сьнезе ў бязьмежную месячную ноч...

Серабрыста-белыя абшары мігцяць міліёнам сьнежных зораў. Сінія цені завілым узорам уплятаюцца ў таемны чар ночы...

Коні мчацца, як віхар. Мінаюць узгоркі і лагчыны. Узьбіваюць пухам ледзяныя іскры сьнегу. Лес. Высокія хвоі, адзетыя беласьнежным уборам, узносяцца маўклівымі статуямі панад гладкай дарогай. Вастраверхія яліны, скупаныя ў халодным сьвятле месяца, як нямыя судзьдзі прыслухоўваюцца да водгаласу пралятаючай зьявы... А месяц здаецца бяжыць разам з коньмі, мінаючы белыя вяршыны асьнежаных дрэў, ясныя валокны лёгкіх хмарак... Ганка мацней прыціскаецца да грудзей любага. У прыгожых вачах яе малюецца захопленьне, страх і зьдзіўленьне. Раптоўны заварот. Сані уразаючыся ў сыпкі курган сьнегу абдаюць халоднымі іскрамі твар. Коні мацней рванулі і зноў марозны імпат захватвае дух...

— Куды едзем? — пытае мілага ціха і трывожна...

Але ён толькі моцна прыціскае яе да грудзей і падганяе імкнучых, як віхар, каней...

Ізноў лес. Вялікія дубы і хвоі засланяюць бляды сьвет месяца. Цёмны гушчар абыймае іх жудаснай цішынёй... Хмары засланілі месяц. Коні наставілі вушы і пачалі фыркаць... Паабапал дарогі паказаліся шэрыя цені, бліскаючы вуглямі вачэй...

— Ваўкі!!!...

— Н.. н.. о.. о.. о!!...

Рванулі коні. Санкі панясьліся з ветрам навыперадкі. Зьвяры скочылі за імі ўдагон...

Выхапіў паляўнічы нож і ня пускаючы лейцаў абярнуўся назад. Дзікім скокам дападае саней воўк, але праколаты падае ў сьнег... Стада затрымалася на момант і зноў прэцца ўдагон... Што раз бліжай, бліжай...

Ах!... Вострыя зубы ўпіваюцца ў маладое цела Ганкі. Страшны, распачлівы крык вырываецца з яе грудзей...

* * *

— Ганка!.. Ганка!.. — Вось работніца!.. — будзіць яе маці...— Вышыўка на зямлі. Вуглі перагарэлі... —

І лагодная, добрая ўсьмешка блукае па завялым, зьнішчаным матчыным твары...

Катовіцы, 20-24. І. 36.

ВІК РЭНО

У вырай

Бела-чорная грамада буслаў абступіла стог сена. Там, пад лесам, на балоце. Плаўна, падымаючы чырвоныя ногі, з павагай высокіх канцлераў, блытаюцца яны каля стогу. Ідзець нарада. Чырвоныя дзюбы час ад часу задзіраюцца да свайго павадыра, што стаіць падняўшы адну нагу на самай шапцы стогу. Важнымі зваротамі доўгае галавы раздае загады. Зараз апошняе слова і бела-чорныя вятругі скрыдлаў зашумяць у бледна-васільковым небе. Паляцяць у вырай, у краіну цёплае бяздзейнасьці.

У вырай — дабравольны вастрог.

* * *

Сядзіць каля стала апёршы на мазалістых руках віхрастую галаву. Скончылася гарачае лета і распружыліся мускулы спрацаваных рук. Сярод іскаркаў радасьці плоднае працы з куточкаў вачэй выступае імгла суму. Глядзіць праз спацеўшае шкло малога ваконца ў халадзеючы прастор.

Бачыць марш буслаў.

Зьбіраюцца ў вырай на адпачынак. — А я? — ціха спытаў ён сябе. Па хаце расплыўся шопат.

— У вырай, на працу.—

І рвануўся, хацеў падняць магутныя скрыдлы да лёту у вырай. Але пачуў, што былі зьвязаныя. Са стогнам апусьціў гордую галаву на халодны стол.

— Сынку, у суседа музыкі, — ідзі пагуляй — лагодна лечыць рану сэрца бязрадная маці.

— Не магу, — раздаецца па стале хрыпавы голас.

* * *

Тах-тах, тах-тах — выбіваюць вальца моцныя абцасы хлапцоў і дзяўчат пад гукі галоснае гармоні. Забыўшыся аб цяжкай долі, моладзь рассыпае сярэбраны сьмех. Была лекцыя, цяпер— скокі, гульні...

А ў яго? Была лекцыя, цяпер — сум...

Блукаецца ў лябірынце думак. Матка ціха выходзіць за дзьверы.

Летам рабіў матцы запас на зіму.

Касіў...

Жаў...

Вазіў...

Малаціў...

Матка пражыве. А ён? — Будзе жыць, абы туды, да крыніцы веды. Туды, туды да працы праз сябе да агулу. Але, як туды дастацца? Калаваротны сылягізм. Разьвязкаю маглі-б быць толькі грошы. А іх няма. І нямаведама, дзе іх узяць. Прадаць няма чаго. Жменя жыта, — і тая, што ён намалаціў, — малавартасна. Пазычыць? Няма ў каго.

Толькі на дарогу. Толькі на дарогу — паўтарае, ківаючы ў такт галавою. Закрывае вочы і ляціць думкамі туды...

Чуе, як званок склікае сьвежую моладзь на лекцыі.

Слухае: дзінь, дзінь, дзінь, дзінь, дзінь — раздаецца над самым вухам.

Уздрыгнуў. Раскрыў вочы. Матка з шчасьлівай усьмешкай сыпала на стол жоўтыя і белыя грошы.

Пазычыла, назьбірала па грошыку з хаты. Табе на дарогу. Заробіш — прышлеш, тады зьвярну, — поўная шчасьця гаварыла матка.

Схапіўся на ногі. Васеньняе сонца іграла на загарэлым твары.

— Зараблю, прышлю — шаптаў ён тулячы да моцных грудзей шчасьлівую матку.

* * *

Сьвісток дыхавічнага паравозу разрэзаў васеньняе паветра. Вагоны высыпаюць падарожных. Хваля натоўпу хлынула ў дзьверы станцыі.

Яго вясёлы твар вітае знаёмае места. Крык і шум рэжа вушы.

Яркім сьветам заліты крывыя вуліцы. Рэклямы пераміргваюцца каляровымі вагнямі. Галосьнікі радыя ткуць сетку крыклівых танго. Натоўп плыве па вузкіх хадніках. Паволі, не сьпяшаючыся, прытуліўшыся адно да другога, пары снуюць перад вітрынамі крамаў. Людзі, забыўшыся ўсе клопаты жыцьця, цешацца цёплымі вечарамі восені.

Яму няма супакою. Усе думкі гуртуюцца каля аднаго слова: — праца. Знайсьці якуюколечы працу.

Бегае, лётае дзень, вечар, вечар і дзень. Усё дарма. Аднак склапатаны, неспакойны, кладучыся спаць, ня губляе надзеі зарабіць і адаслаць матцы пазыку.

Лёг змучаны, як ніколі разьбіты...

* * *

Не, ён не паддасца. Моцны, цьвёрды нагне нелітасьцівы лёс да свае ўслугі. Поўны веры ў свае ўласныя сілы закрыў вочы з усьмешкаю на вуснах. Думка пачала путацца ў імгле салодкага сну. У вушох зьвіняць гукі радыя.

Добра яму, лёгка...

Будучыня маніць абяцанкамі лепшага. Заўтрашні дзень сьвеціць яснасьцю цёплага сонца. Вясёлкавыя кругі расплываюцца перад вачыма ад аднаго пункту, які з бесканечнае далечыні ляціць проста на яго, а пасьля стварае вобраз знаёмага твару. Твар маткі, уквечаны яснымі праменьнямі, усьміхаецца да свайго сына. Сын вітае матку. Сьмяецца, бо ўжо патрапіць сагнаць чорную хмару з гарызонту шэрага жыцьця маткі. Прайшлі дні клопату, шуканьня працы. Ён, моцны ўладар свайго лёсу, калышыцца на хвалях мора-жыцьця.

Тысячы, міліёны паднявольных працягваюць да яго рукі з цёмнае глыбіні, а ён усіх горне да сваіх магутных грудзей і добра яму — ён жыве — жыве міліёнамі.

А жыцьцё гэтае... Тое, што шукаў, да чаго імкнуўся, само прыбліжаецца да яго; а тыя, што не давалі працы, заробку на доўг маткі, бесканечнаю чаргою пачынаюцьісьці да яго, прасіць выбачэньня за сваю адмову. Яны ідуць, каб сказаць, што ёсьць праца, якая выбавіць яго матку з клопату. Яны ідуць. Ён чуе і сьмяецца. Чуе, як ключ скрыпануў у замку. Ціхі скрып дзьвярэй. Сьвет электрычнага фанара маланкай зіхануў у цемры пакою. Балючай іскрай упаў на векі закрытых вачэй. Ах, як закалоў у глыбіні вачадолаў. Непраглядная цемра спавіла ўтомленае цела, а слух раніў бразг сталі.. Няведамая рука сьцягнула заслону спакойнага сну.

Схапіўся і пачуў, як яго прасілі ў паднявольны «вырай»..

Вільня.



П. Сергіевіч „Кастусь Каліноўскі“

З Усходняе Беларусі

МАКСІМ ЛУЖАНІН *)

Галасы гарадоў

матар'ялы на поэму

Штосьці
  слоў не хапае,
дужа скупа радкоў...
Чыкільгае
  дурная
тут гіронія зноў.

Каб пачулі
  мой выраз,
ўзмах (ад сэрца)
  рукі —
я хачу
  быць
  так шчыра,
як ніколі
  ні з кім.

Каб унікнуўшы
  сварак
і турбот міліён —
сустракаць сваю старасьць,
быццам
  майстар Брэньён.
Так
  ці раз лятуценіў
я пад цяжкі настрой,
калі
  дрогнуць калені
  і
  сьцюдзёніцца кроў.
Не таму мне холадна,
што ня веру
  ў наш час.

*) Лужанін Максім — гэта псэўдонім А. Каратая, аднаго з лепшых беларускіх паэтаў-лірыкаў Усходняй Беларусі. Радзіўся ў 1909 г. у Случчыне. Скончыў пэдагогічны тэхнікум. У 1928 г. уступіў на літаратурна-лінгвістычны аддзел пэдагогічнага факультэту Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. Быў сябрам літаратурнага аб'еднаньня „Узвышша". Друкавацца пачаў у 1925 г. Вершы з 1926, 1927 і 1928 г. г. зьмешчаны ў зборніках: „Крокі", (Б. Д. В., Менск, 1928 г.), „Новая ростань", (Б. Д. В., Менск, 1930 г.); вершы з 1929, 1930 і 1931 г. — зьмешчаны ў чатырох зборніках: „Неаплачаны рахунак" (Б. Д. В., Менск, 1930), „Аднагалосна", „Кастрычнікам! Ліпнем! Маем!" і „Галасуе вясна за вясну".

„Літературная энцыклопедия", (т. VI, Москва, 1932) піша аб Лужаніне так: „Вершы першага пэрыяду яго творчасьці поўны асабістых, інтымных перажываньняў. Савецкая сапраўднасьць яму чужая. Ён не адчувае ў сучаснасьці грунту пад нагамі. У яго творчасьці заўважываецца вялікі уплыў нацдэмаўшчыны; савецкай рэчаіснасьці ён супроцьстаўляе ідэалізаваную мінуўшчыну (Беларусі — рэд. „Калосься"). У вершы, прысьвечаным гадаўшчыне Кастрычніка (1928), ён піша: „Мы ня хочам радасьці вітаць, што чужымі дадзена рукамі". Аллюстроўваючы кулацкую нац - дэмакратычную ідэолёгію ў першыя годы свайго творства. Лужанін у апошніх сваіх творах, аднак, паступова адходзіць ад нацдэмаўскіх установак".

Друкуем у гэтай кніжцы „Калосься" тры адрыўкі з твору пад загалоўкам: „Галасы гарадоў", надрукаванага ў літаратурным журнале „Узвышша" (Менск, 1931 г.). Рэдакцыя.

Мая ў гэтым паходня —
шмат ярчэй,
як у вас.
Без халоднай развагі,
сэрцам
чуючы век,
не надужыўшы цягліц
гэты рос чалавек.

Я,
ў сваей маладосьці,
многа
бачыў відна.
Месца чорнае зглосьці
заступала вясна.

Але хіліць
да плачу,
сэрца
кроіць мне згук:
шмат я дзіўнага бачу,
а падняць
не магу.
Можа —
гэта юнацтва —
час
вясёлай хады.
Я мяркую застацца
назаўжды
малады.
Каб нашчадкам вясёлым
найшчасьліўшай зямлі —
так
аддаць
гэты золак,
як яго
мы ўзялі.

Ды ня йдуць нешта песьні,
сам-жа троіў
ральлю.
Згадка блісьне балесна:
мо' ня тое раблю?
Можа-б лепш
пад ударам
паддавалася сталь,
можа-б
быў
ў загары
я адменны каваль.

А то —
ўзьбіўся на вершы —
ні туды —
ні сюды...
і блукаю ня еўшы
з сэрцам
поўным лухты.

І вось гэтую тэму
вывеў
(зноў-жа)
на зман:
„матар'ялы поэмы“,
а поэмы —
няма.

Ўсё кудысьці сьпяшаю,
ўсё
шукаю чагось...

Мо' праз гэта
у краі
буду лішні
я госьць.

Каб вы зналі, таварышы!
Дзень...
Дзень...
быў ясны...
Такі,
як сон,
што ў маленстве бывае,
сон,
што аднойчы прысьніцца
сон.

Уздымалася —
(з за лясоў).
Прыназемілася —
(на пясок).
Разьвілося —
(як паясок).

Люстравалася —
на вадзе.

Сусьцігалася —
            у хадзе.
Залацілася —
            ў барадзе.
(Значыць, сонца—была й рака)
у старэнькага
            рыбака.

Значыць сонца...
            Яно, як сон, —
кіне
восеньню галасоў
над галовамі
            ўсіх лясоў,
жоўтатвары свой парасон.

І тады —
        палятуць далоў
птушкі жоўтыя
        без галоў,
птушкі зморaныя,
        бяз крыл
            у вятры.
І тады —
        зашасьцяць лісты,
да вясны
        абляцяць яны,
будзе
    дзікі іх сівер крыць,
будзе
    дзіка мяцеліца выць,
будзе
    сьнег ім пасьцелю слаць,
каб —
    на костках трава расла—
птушак жоўтых
        без галавы,
птушак зморaных
        і бяз крыл.
Павуцінны асеньні шоўк,
залацісты паркаль лістоў.

І лясы ўсе —
        як церамы,
і хаціны ўсе —
        як дамы,
з нейкай казачнай
            зямлі,
што ў лятунках
        даўней былі.

Недалёка ўжо да зімы.

І праходзіць
        яна
            між іх,
госьцяй ладнаю
        удавой, —
вымярае
        густы удой
і
падлічвае
        ураджай,
наймудрэйшым
        малюнкам
            з кніг
аздабляе цябе,
        мой край.

Край мой —
        гэта ня поле й лес,
Край мой —
        гэта ня бруд і твань,
Край мой —
        гэта ня лапці з лык,
дзе —
    гібеюць, як на смале,
дзе —
    панурваецца галава,
дзе —
    бядуе „дурны мужык“.

Мо' й да гэтакага
        хто звык.
Але маючы
        вочы й слых—
прыпыніся.

        Пачуеш ты
думкі накшае яснаты:
новым гукам
        ударыў смык,
новай арміяю
        музык.

Край мой —
гэта адзіны рух,
Край мой —
моц гартаваных рук.

Край мой —
вольты вялікіх воль...
Калі мы
здабывалі зару, —

называўся ён —
Беларусь...

Я сягоньня
згадаў адну
песьню
ясную
пра вясну,
бо
назначыўся
гэты
кон,
калі быў яшчэ
блазьнюком:
„Пра вясну
песень мала —
замянілі
на восень вясну.

Я
на простых,
вясковых
цымбалах
заіграю адну
і вясну
ўспамяну.

Думы
кволасьцць кране,
і туга
замаўкае,
бо па нашай
па ўсёй старане
йдзе вясна
і вясна
маладая“.

За тое,
што на полі
на нашым
рунь,
За тое,
што на яблынях
на нашых
цьвет,
За тое,
што будзіць
ад сну
зямлю —
я
вясну,
як сястру,
люблю.
У-ух!
як прыкра
заспанага стрэць!

КУЗЬМА ЧОРНЫ *)

З раману:

„Трецяе пакаленьне“ **)

Дні два, у гарачую пору, над лесам, можна было бачыць дзіўны малюнак: груганы і вароны ўзляталі з крыкамі густа і зноў спускаліся ў вершаліны хвояў. Так кіпіць вада ў крыніцы. Зьверху плаваў дробны каршачок, баючыся спусьціцца ніжэй: мусіць, там арудвала буйнейшая штука, якое каршачок баяўся. У канцы другога дня падзьмуў вецер і на гэны бок зьвілістай ручаіны чутно стала трупным пахам. Птушыны крык чуўся мацней.

Лес стаяў высока. Мясцовасьць ішла да яго ўгару. Па гэты бок лесу, схаваная ў нізкарослых зарасьніках, мінаючы каменьні і ўзгоркі, імчалася ручаіна. Паўз яе, скрозь краем лесу, вілася добра вытаптаная сьцежка. Змрок і цішыня панавалі тут.

Было яшчэ гадзіны дзьве да вечара, сонца яшчэ толькі падыходзіла да лесу, калі на гэтай сьцежцы з'явіўся чалавек. Ён быў шырокаплечы, на выгляд здаровы. Боты яго былі ў высахлай на іх зямлі. Ня гледзячы на гарачыню, на ім была накінута наапашкі жаўтавая, зьлінялая, салдацкая целагрэйка. Гэтая кароценькая вопратка была паношана: мясцамі ўнізе ў ёй вісела, з-пад адпоратай падшэўкі, вата. Ішоў чалавек паволі, стомленай паходкай. Адразу відаць было, што гэты чалавек спрацаваны.

---

*) Пад псэўдонімам Кузьма Чорны — пісаў і піша Н. Раманоўскі, беларускі пісьменьнік Усходняй Беларусі. Радзіўся ў 1900 г. К. Чорны — гарадзкі інтэлігент, аднак інтэлігент моцна зьвязаны з вёскай, — кажа Кучар у „Вялікай перабудове“ (Менск, 1933). — Быў сябрам літаратурнага аб'яднаньня „Узвышша“. Пачаўся друкавацца ў 1924 г. Многа напісаў апавяданьняў і раманаў. Адны з раньніх кніжак Чорнага „Верасьнёвыя ночы“, „Хвоі шумяць“ і „Пачуцьці“ зьмяшчаюць многа апавяданьняў, якімі паказаўся аўтар як вялікі, плодны і творчы талент - мастак, як знаўца беларускае вёскі, беларускага народу, як псыхолёг і філёзаф. З раманаў ранейшае пары, да 1929 г., вызначаюцца „Зямля“, „Сястра“, пазьнейшае — „Ідзі, ідзі“ („Раскрыжаваньне“), „Бацькаўшчына“, „Трэцяе пакаленьне“.

Паводле „Малой советской енцыклопедии“ (т. IX, Москва, 1931 г.), творчасьць Чорнага ранейшае пары—„выяўляе дробна-буржуазную сутнасьць яго сьветапагляду. Чорнага інтэрэсуе не соцыяльна - клясавы чалавек, а чалавек агулам. Апісываючы сучасную вёску, Чорны не заўважвае клясавай барацьбы. У рамане „Зямля“ (1928 г.) Чорны падходзе бліжэй да савецкай рэчаіснасьці, яго ідэя „уласнасьці да зямлі“ усёж-такі домінуе над усім. Вясковыя камуністы ў рамане паказаны нейкімі гуманістамі і сузіральнікамі, а не барацьбітамі. Цяпер Чорны далучыўся да тэй групы пісьменьнікаў „Узвышша“, што стараюцца перагледзіць свае творчыя і палітычныя пазыцыі“.

Трэба дадаць, што „Узвышша“, аб якім вышэй гутарка, ад 1932 году зьліквідавана. Чорны пасьля сваей перабудовы, пасьля „перагляду сваіх творчых і палітычных пазыцыяў“ — піша згодна з духам палітычнага бальшавіцкага рэжыму ў Савецкай Беларусі.

**) „Трецяе пакаленьне“, бач. 297, 1 нлб. фарм. 8. Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, Менск, Лім, 1935. Рэдакцыя.

Твар яго быў вельмі малады. Наўрад ці было яму нават дваццаць чатыры гады, у кожным разе ня больш. Але дзіўная справа: ён быў апусклівы, няголены. Барада і вусы расьлі няроўна і ня густа. Чалавек нёс на плячы палавіну, відаць знойдзенай на дарозе, дугі. У адным месцы ён спыніўся, стаў сьпіной к лесу і спаміж кустоў глянуў на прырэчнае поле. Там была папарная ральля. Чалавек гаварыў сам з сабой.

— Яшчэ павінна добра ўпрэць. Яшчэ пасьпею заскародзіць і раз перааараць пад жыта.

Ён акінуў вокам шырыню палетка і раптам занепакоіўся:

— Што за ліха, як-бы ў мяне вузей, чым унь там. Мералі, чэрці, надзялялі, аднаму болш, другому менш. Душы ў кожнага здаецца-ш роўныя!

Ён шпарка вярнуўся, перамераў крокамі суседні палетак, пасьля свой і тады паспакайнеў:

— Чорт яго, гэта мне здалося.

І пайшоў далей, роўна пагойдваючы плячыма. Дзьмуў вецер, сонца падбіралася да самага лесу. Крокаў праз сотню чалавек падняў галаву ўгару:

— Зноў крычаць, унімку на іх няма!

Непадалёку, над самай прырэчнай хвояй, аж кіпела вараньнё. Каршачок таксама плаваў, як і ўдзень, як і ўчора.

— Што там за ліха, — бурчэў сам сабе малады чалавек, — падлу хто выкінуў, ці якая трасца? Другі дзень ад груганьня, як у гаршку кіпіць. Цьфу!

Ён пераклаў недаломак дугі на другое плячо і рушыў далей. Яшчэ крокаў праз сотню ён увайшоў у паласу ветра, якраз з таго месца, над якім узьвівалася вараньнё.

— Ого, — спыніўся чалавек, — у нос дае!

Цікаўнасьць пацягнула яго туды. Ён ішоў, размаўляючы сам з сабой:

— Хто-б гэта мог падлу выцягнуць? Здаецца-ж ні ў кога... А можа воўк здох?

Тут цікаўнасьць яго вырасла ўтройчы: пэрспэктыва ўбачыць здохлага зьвера не такая ўжо нецікавая рэч чалавеку, які нічога ня бачыць, апроч свае хаты, свайго поля і гэтай сьцежкі. Ён пайшоў подбегам. Дайшоўшы да месца, ён аж жахнуўся, аж адскочыў назад.

— Ах, браткі-ж мае!

Ён пабачыў чалавечы труп. Труп ляжаў у самай гушчырні, нагамі ў вадзе, грудзьмі ўгару, на крутым беразе. Здавалася, што труп сядзіць.

Да голай пяты ў рачным драсьне папрыліпалі ракі. Варушачы клешнямі, яны лезьлі адзін да аднаго, дабіраючыся да пачатага месца. Сонца глянула зьверху і асьвяціла труп і іх, і ваду. Убачыўшы чалавека, груганьнё зьнікла ўмомант. Спалоханы нечаканасьцю, чалавек адумаўся. Ён падышоў бліжэй і агледзеў труп. Яму было страшна і агідна глядзець. Адно плячо ў трупа

трымалася вышэй, другое ніжэй. Было ладобна, што труп стараецца абаперціся рукой на жвірысты грунт гэтай дробнай рачулкі і ўстаць. Пляшывая галава трымалася проста, рысы твару ня былі папсаваны гвалтоўнай сьмерцю — відаць сьмерць наступіла адразу. Толькі стрыжаныя вусы былі запэцканыя і закарэлыя.

Калі-ж малады чалавек глянуў на труп ззаду, яму стала яшчэ страшней і агідней. Над вухам, бліжэй да задняй часьці галавы, была рана. Льга было пазнаць, што па галаве стукнулі нечым цьвёрдым. І ад гэтага галава пакінула жыць. Груганьнё пасьпела ўжо раскляваць рану аж да шыі. Тое цьвёрдае, чым, відаць, білі па галаве, валялася тут-жа. Гэта была сукаватая ламачына, кавалак высахлае лясное старадрэвіны. Яна была ў крыві. Малады чалавек гэтую даўбешку ўбачыў адразу. Ім апанаваў такі жах, што ён кінуўся адгэтуль ходу, адцураўшыся і знойдзенага на дарозе недаломку дугі. Будучы ў гэтай справе нявінны, як ягнё, ён аднак з баязьлівасьцю думаў, паддаючы ходу: „заявіць, ці не? А што, калі падумаюць на мяне? Чорт ім верыў! Няхай лепш хто іншы ўбачыць і заявіць, а мне нашто ўмешвацца, лепш трымацца стараны. А калі хто з-за куста глядзіць? Тады будзе яшчэ горш: бачыў і не заявіў. Пагнала-ж мяне якраз бо сёньня ральлю аглядаць!“ Такі кірунак думак паказваў, што чалавек гэты быў сапраўды нявінны тут, але разам з тым, быў, відаць, напалохан жыцьцём; можа нават з прыглушанай, забітай душой. У яго вачах стаяў гэты спушчаны к вадзе з крутога берагу труп.

Але ўжо адышоўшыся крокаў трыста, малады чалавек пачаў спакайнець. Ён пайшоў цішэй і думаў ужо, як ён зараз пойдзе ў сельсовет і заявіць. „От народ кінецца глядзець!“ Такі паварот у думках выяўляў няўроўнаважаную натуру гэтага чалавека. Ён ішоў ужо зусім паволі. От ён убачыў пры дарозе сям'ю грыбоў.

— Мусіць тут ніхто не хадзіў гэтыя дні, — гаварыў ён сабе. – Грыбы пры самай дарозе чарвівеюць. Дзіва што гэтага мерцьвяка ня ўбачылі дагэтуль.

Прывычка гаварыць самому сабе бывае ў людзей, прывыклых да адзіноты, або адданых ёй сваёй натурай. Малады чалавек вырваў грыбы і панёс іх у руках. Па дарозе адзін грыбываліўся з рук. Чалавек нагнуўся надняць яго і ўбачыў у сябе пад нагамі грошы — дзьве трохрублёўкі, зусім новыя, ня зломленыя згортваньнем. Радасна паднімаючы грошы, ён абсалютна ня думаў, што гэта можа быць як-небудзь зьвязана з трупам. Пра гэта ён падумаў толькі тады, калі праз некалькі крокаў знайшоў яшчэ грошы. Тут быў ужо цэлы пачак новенькіх трохрублёвак, акуратна пераклееных стужкай белай паперы. На паперы было напісана „300 руб.“.

— Пра мерцьвяка заяўлю, а грошы — хто бачыў, што яны ў мяне? — шаптаў высахлымі губамі чалавек, запіхаючы грошы глыбока ў халяву.

Цяпер ён раскінуў розумам: калі чалавека забілі з-за грошай, то чаго яны валяюцца па дарозе? Калі забойцы гэтыя грошы згубілі, то як-жа гэта яны не пільнаваліся іх, забіўшы з-за іх чалавека? А калі гэта толькі частачка грошай, то адкуль такая вялікая сума ў так бедна адзетага чалавека? (Труп быў у сялянскай рванай адзежы, босы). Ня могучы ні да чога дадумацца, чалавек пайшоў далей, ні разу не азірнуўшыся. Ён мінуў лес і спусьціўся ў палявую лагчыну. Там стаяла некалькі хат, новых, але неяк не ўладжаных: адна бяз шчыта, другая без сянец, трэцяя без агарожы і ўсялякіх гаспадарчых прыбудовак. Хоць новыя сьцены і пашарэлі ўжо ад гадоў, але відаць было адразу, што жыцьцё тут ніяк ня можа ўсталявацца. Калі ёсьць адно — не хапае другога, і доўгімі гадамі будзе яно наладжвацца, пакуль ня стане сшрубавана ўсюды як і трэба. Але пакуль гэта можа стацца, то першыя шрубы паржавеюць, а пакуль яны заменяцца новымі, то ўжо і апошнія павывальваюцца. Так і ідзе ўсё тут, ня маючы ніколі свайго сталага завяршэньня.

Хаты стаялі адна ад адной наводдалек, бяз вуліцы, у непарадку. Чалавек падышоў да першае. На маладзенькай арабінцы перад вокнамі чырванела пучкоў тры ягад — першы ўраджай на маладым дрэўцы. На плоце сушылася дзіцячая кашулька. Сонца пачынала заходзіць, на двары шарэла. Чалавек увайшоў у хату. Дзяўчынка, малая, наўрад ці ёй было і шэсьць год, перастаўляла на стале дробныя калодачкі, каштаны і жалуды.

— Тата, — узрадвалася дзяўчынка, — паглядзі, каштаны — гэта каровы, жалуды — гэта авечкі.

— Дзе-ж маці? Бач, як ты гуляеш, жывёлы ў цябе многа. Ну, гуляй сабе.

Ён некалькі хвілін стаяў над дзяўчынкай, ня зводзячы з яе вачэй. Ён штосьці думаў. Нарэшце пагладзіў дзяўчынку па галаве і пайшоў з хаты. У сенцах ён спаткаўся з жанчынай. Яна была здаровая, жоўтавалосая. Сонца стаяла нізка над полем і праз адчыненыя дзьверы асьвечвала жанчыніную постаць. На твары яе былі рэшткі вяснушак, вочы былі задумёныя, разважлівыя. Як загаварыла яна, у голасе гучэла сталасьць. Сваёй жаночай сталасьцю яна вабіла да сябе. Так гэтая сталасьць натуральна была ёй да твара. З выгляду ёй можна было даць год дваццаць чатыры. З першае фразы, якую яна сказала да чалавека, льга было бачыць, што яна мае здольнасьць наглядальнасьці, можа шмат што заўважыць. Яна сказала:

— Што ты такі, нейкі... Устрывожаны ты чым, ці што?

Ён адказаў:

— Каб ты ведала што! (Урачыстая і трывожная паўза). — Толькі барані цябе Божа, калі каму раскажаш, або хоць адным словам...

— Гавары хутчэй!

— Нікому ні слова. Маўчы—і ўсё. От я табе зараз пакажу.

Ён паволі выцягнуў дзьве трохрублёўкі.

— Што ты мне іх паказваеш! Што ты такі зьбянтэжаны.

— Знайшоў на дарозе. Нагнуўся грыб падняць. Бачу — грошы. Каб ты ведала, які жах мяне агарнуў! Ты ведаеш, што я каля рэчкі бачыў? Труп валяецца, нагамі ў вадзе ляжыць.

Труп? Бяжы ў сельсовет, заяўляй хутчэй пра ўсё.

— Пра што — пра ўсё? — храбрыўся перад жонкай чалавек. — Пайду скажу, што труп валяецца. (Раптам ня вытрымаў штучнай храбрасьці). Які жах! Нагамі ў вадзе, і ракі пяты грызуць. Гніць пачаў. Я іду, сонца над лес спускаецца...

— То чаму нікому ні слова не казаць? Пра што гэта ты гаварыў, каб не казаць нікому? Мож а пра грошы гэтыя, што знайшоў каля трупа? Колькі ты іх знайшоў?

— Я-ж табе паказаў.

— Хлусіш! Ты больш знайшоў! Ты ўстрывожыўся і прагаварыўся! Зараз-жа ідзі, заяві і аддай грошы. (Губы яго задрыжалі). Ты што кулакі сьціскаеш? Ты глядзі! Пакажы кішэні.

Ён вывярнуў усе кішэні.

— На, глядзі, ты мне ня верыш? Ты заўсёды такая. Ты заўсёды мяне маеш, чорт ведае, за каго. А калі я гэтыя дзьве трохрублёўкі і захацеў пакінуць пры сабе, то што гэта, важны інтэрас? Усё адно чалавек не ажыве, а жывому — шэсьць рублёў гэта ня грошы? Унь дзіця ў нас расьце, перад векам сваім стаіць, а яшчэ ўсё на сьвеце можа быць. Ты ніяк пра дзіця ня дбаеш, ты думаеш, што дзень пражыў, то і дзякуй Богу? А што наперадзе? Ты думаеш вайны ня будзе? Яшчэ можа прыдзецца дзіцяці голаму і босаму па дарогах бадзяцца, бяз бацькі і маткі ўміраць з голаду! А ты літасьці ад людзей чакаеш? Кожны сабе зарваць стараецца, а ты думаеш, што ўсе добранькія?

Ён увайшоў у сваю ролю. Ён думаў: „добра, што я ўпору схамянуўся і не паказаў ёй пачкі трохрублёвак. Чорт мяне пацягнуў за язык сказаць ёй, каб „нікому ні слова“. Траха не прагаварыўся. Цяпер будзе здагадвацца. Што я нарабіў“!

Спусьціўшы галаву, ён пайшоў з сянец. Постаць яго панура гойдалася над каляіністай дарогай. Праз хвілін дзесяць ён быў ужо ў сельсовеце і заявіў, што бачыў каля рэчкі труп. Дзьве трохрублёўкі ён аддаў адразу.

А. БУЖАНСКІ

Да беларускай літаратурнай творчасьці ў Заходняй Беларусі

Прыглядаючыся да выдавецкага руху і да зьместу пэрыядычных выданьняў у Заходняй Беларусі, можна заўважыць, што беларускі чытаючы агул даўно ўжо чакае сваіх бэлетрыстаў. Маючы поэтаў з няштодзенным талентам, наш чытаючы агул усьцяж азіраецца шукаючы мастацкае прозы і, пакульшто, астаецца нездаволеным у гэтай галіне.

У журналах, каторыя выходзілі, ці выходзяць, можна знайсьці маленькія эскізы, адрыўкі з нечага, што мае выйсьці друкам, але калі чытачы дачакаюцца бэлетрыстыкі ў агульнапрынятым разуменьні гэтага слова, нажаль, конкрэтных дадзеных ня маем.

Адносна вершаў, дык крызысу не адчуваецца — наадварот, можна сказаць, што ў літаратурным жыцьці ў Заходняй Беларусі — гіпэртрофія поэзіі прычыняецца да атрофіі прозы.

Рады поэтаў усьцяж павялічваюцца.

Рэч зразумелая, што масавая продукцыя поэзіі ёсьць катэгорычным імпэратывам у пару нацыянальнае летаргіі і ўпачатку адраджэньня; калі потэнцыянальныя магчымасьці народу яшчэ не аб'явіліся — тады поэзія, як найбольш эмоцыянальны від літаратуры, пачынае красаваць і буйна разьвівацца.

Дзеля таго, што гэты пэрыяд беларускі народ мае ўжо за сабою, дык трэба думаць, што з „фордаўскай" фабрыкацыяй вершаў можна было-б стрымацца.

Як-бы не разглядаць беларускую поэзію, ці то агулам, ці творчасьць у Заходняй Беларусі ўасобку, сьцьвердзім, што ў гэтай галіне ёсьць запраўды чым пахваліцца.

Пройдзены аграмадны шлях, зроблена колёсальная работа, душа народу выявіла сябе ў поэзіі ўсебакова. Ад сьлёзлівых тонаў нашаніўскае пары да бадзёрных акордаў сучасных лірыкаў і ад прымітыўных, што да формы, вершаў першых адраджэнцаў — да прэцызыйна абробленых пэрлаў.

Калі возьмем поэтаў Заходняй Беларусі, дык сярод іх знаходзяцца адзінкі, творы каторых можна паставіць побач твораў лепшых эўропэйскіх сымболістаў. Некаторыя рэчы Машары („Валачобнае", друк. у „Нёмане") ня ўступаюць поэмам Андрэя Белага. Наагул, пісаць мімаходам аб Машары няма сэнсу, аб ім трэба пісаць цэлую монографію.

Творчасьць Н. Арсеньневай у антолёгіі сучаснай беларускай поэзіі займае першараднае месца. А калі яе ліра ня мае розга-

ласу ў сьвеце, дык толькі дзякуючы таму, што ня маем, або маем вельмі мала сілы папулярызуючай беларускае мастацкае слова заграніцай.

Возьмем зборнік поэзіі перадавой італіянскай поэтэсы Ады Нэгрі „Canti dell' Isola". Знойдзем тамака шмат супольнага з вершамі Натальлі Арсеньневай — і формаю і зьместам, асабліва мяккімі нюансамі супольнымі абедзьвём пясьняркам. Прыгэтым уважлівае параўнаньне, бязумоўна, выйдзе на карысьць Арсеньневай. Тымчасам італіянская поэтка мае сусьветны рэзонанс, а слава беларускае не перайшла за этнографічную мяжу бацькаўшчыны.

Наша поэзія прайшла ўжо ўсе стадыі разьвіцьця. Не хапае толькі перакладаў з Вэрхарна і Бодлера (пераходная ступень), каб кшталтам расейскае поэзіі напярададні рэволюцыі дайсьці да „заумнага" языка футурыста Кручэных, або да эстэтычнага дэкадэнтызму Ігара Севераніна — („О лилия ликёров, — о Crème de Violette"!)

Робячы вывады з вышэй сказанага, прыходзім да перакананьня, што ў бягучы мамэнт, калі чулыя „апякуны" счырківаюць Беларусаў з этнографічнае карты Эўропы (з палітычнае карты нас ужо даўно хімічна вывелі), неабходным ёсьць для Беларусаў выявіць сябе ў галіне духовай, перадусім у бэлетрыстычнай літаратуры. Трэба форсоўна разбудаваць бэлетрыстыку Зах. Беларусі. Бэлетрыстыка Усходняе Беларусі, дзякуючы свайму спэцыфічнаму характару, у сучасны мамэнт ня можа прадстаўляць агульнабеларускую літаратуру, апрача таго яна слаба да нас даходзіць.

І тут ізноў даходзім да выхаднога пункту: у галіне мастацкае прозы маем сяньня адно толькі адрыўкі з нечага, фрагмэнты чагосьці прыабяцанага — адным словам імглістыя рэчы, замест літаратурнае дзеяльнасьці. Але, паўтараем, вершаў аж зашмат.

Трэба сабе ўявіць, з практычнага боку, што поэзія вельмі цяжкая дзеля перакладаў на чужыя языкі, заціраецца і не выкарыстоўваецца,—тады, як невершаванае прыгожае слова магло-б стацца нашым рэпрэзэнтантам у Эўропе. Бо яно выкажа нашы імкненьні, наш смак, увыпукліць наша самаістнае аблічча і будзе найлепшым антыдотум проціў інсынуацыяў цёмных сілаў паборваючых беларускую вызвольную думку.

Гаворачы аб літаратурнай творчасьці маладых сілаў, трэба паставіць пытаньне рубам: высокавартасьцёвыя рэчы трэба друкаваць і заахвочваць аўтараў да далейшае працы, аўтараў маючых толькі проблематычныя шансы зрабіцца ў будучыні паэтамі— стрымліваць ад непатрэбнае працы, скіроўваючы на шлях бэлетрыстычнае творчасьці. Няхай пакінуць рымы і ассонансы і прабуюць працаваць у прозе, у галіне, дзе ёсьць аграмаднае запа-

трабаваньне і вялікія прабелы. Гэтую справу трэба рэгуляваць і абвесьціць ударным заданьнем дня.

Трэба работнікаў пяра падпарадкаваць грамадзкім запатрабаваньням.

Трэба прывітаць пачын рэдакцыі „Шляху Моладзі“, што ў сваім часе абвесьціла конкурс на расказ. Але гэтага мала. Трэба расьпісаць конкурс на роман і ўключыць увесь літаратурны актыў у гэтую работу. Трэба разгарнуць спаборніцтвы і прысвоіць стаханаўскія мэтоды работы.

Няхай нашы пісьменьнікі дадуць сэнсацыйны роман, няхай створаць псыхолёгічную повесьць, няхай займуцца гэтай патрэбнай справай.

Беларускае жыцьцё апошніх часоў дае багаты фон і рознаякія сюжэты для акцыі роману.

Рэч вельмі характэрная: чужыя сучасныя пісьменьнікі ўжо карысталі з беларускай тэматыкі, але гэтая-ж самая тэматыка ніяк ня здолела захапіць беларускага літаратара.

Уздым і канец Грамады, пераплятаючыся з асабістымі нутранымі конфліктамі герояў, — гэта-ж багацейшы матар'ял для трылёгіі, які чакае сваіх Шалом Ашаў, Аляксеяў Талстых, Стругаў...

Рамантыка, каторая да апошніх часоў ахінала дзейнасьць Грамады (ўсёроўна—ці гэта была нацыянальная эпопэя, ці арлекінада, таксама, як і павадыр Грамады—народны трыбун, ці П'еро?), чамусьці дагэтуль не аказалася годнай увайсьці ў літаратуру Заходняе Беларусі.

Канчаючы, можна выказаць сваю пэўнасьць, што ня гледзячы на натугі цёмных сілаў, калі паважная і цікавая беларуская кніжка пашырыцца па Зах. Беларусі і адначасна знайдзецца на паліцах загранічных выдавецтваў, тады акт 25 сакавіка з далёкае пэрспэктывы прыблізіцца да нас на бліжэйшы дыстанс і стане напярэдадні трывалае рэалізацыі.

АД. САЛАДУХ

Беларускі элемэнт у повесьці Ант. Мільлера „Powołanie“

Рэгіональная і разам аўтобіографічная повесьць пад вышэйазначаным назовам вышла яшчэ ў 1928 г. Актуальнасьці сваей для Беларусаў ня страціла яна дагэтуль і варта ей пасьвяціць крыху ўвагі.

Затрымліваюцца над будовай повесьці ня буду, бо ў гэтым артыкуле ідзець мне толькі аб тое, каб аднатаваць — і магчыма верна — беларускі элемэнт, які аўтар уплёў у яе.

Повесьць адносіцца да 1890 году; аснавана яна на грунце польска-літоўскіх адносінаў каталіцкага клеру ў Літве і Беларусі; акцыя адбываецца: ў Вільні, Бірштанах, Немонюнах, у дарозе да Кучкурышак, у Полацку і ўзноў у Вільні, у Крожах і ўрэшце канчаецца ў Вільні. Расеяй кіруе цар Александар III „Міратворац“, стасуючы да сваіх падданых палітыку яўна „ограничительскую“. Рэакцыя трыумфуе. Беларусь крэпка сьпіць і аб беларускай справе няма й мовы. „Северо-Западным Краем“ кіруюць цьвёрдай рукой віленскія генэрал губэрнатары Каханов і Оржэвскій. Адным з асяродкаў, што ў гэтым часе ўмеў жыць уласным жыцьцём, была каталіцкая духоўная сэмінарыя ў Вільні. Ад яе Мільлер і распачаў у повесьці „Powołanie свой расказ.

Польска-літоўскі спор у сэмінарыі ўжо ўпоўні. Аб Беларусах першы раз паяўляецца ўспамін, калі інспэктар Ключынскі (у повесьці Замчынскі) гэтак напамінае занадта адданага музыцы сэмінарыста Альфрэда Шыльлера: „Касьцёл у Літве патрабуе духоўнікаў-жаўнераў, а не трубадураў. Забываешся, што жывём на быўшых рубяжох Рэчыпаспалітай з беларускім і літоўскім насельніцтвам, духова і палітычна з намі асыміляваным. Нясём яму збаўленьне на вастрыі эвангельскіх радаў! Таруем Рыму дарогу на ўсход“... (бач. 50). Здольны да глыбейшых рэфлексыяў сэмінарыст гэны ў сваім дзеньніку напісаў: „Разумею, што хто пойдзе з місіянарскім крыжам у Расею, той станецца ахвярай. Без ахвяры скрыпкай не разбуджу божых думак у Хама Вялікай і Белай Русі. Калі маемо наварачваць, дык неаднымі мастацкімі сродкамі. Цёмнага Беларуса ці Маскоўца трэба страшыць *серкай з пекла, смалой з пупа бэльзэбуба!* Лягчэй яго пераканаць абразом Люцыпара з рагамі, як пэмазком Рафаэля ці Мурыльля“ (51). Раз, пасьля добра адбытай споведзі, Шыльлер падае ў дзеньніку урыўкі пачутай ад спаведніка навукі і свае разважаньні: „Не пара на нацыянальную калатню, што можа разбудзіць інстынкты людзкой бэстыі. Прызнаў я яму слушнасьць, хоць ня таю, што душа мая аднолькава тужа як да гуку мовы беларускай, так і Цыцэрона“. (53). Яшчэ лепш зарысоўваецца духовы абраз

Шыльлера ў наступных выражэньнях: „Уважаю сябе за Паляка... Аднак часамі, калі паддамся навальніцы ўспамінаў... надыходзяць хвіліны духовага неспакою і сябе пытаю: кім я ёсьць, што люблю, якія мае суб'ектыўныя палітычныя нахілы? —

„Здаецца мне, што я на раздарожжы. Хоць я ўдыхнуў у сябе расчыну культуры польска-лацінскай і чуюся генэтычна зьвязаным з польскай нацыянальнасьцяй, — чую адначасна, што люблю Беларусь, што люблю яе мову. Паходжу з Вітэбшчыны... Магу, знача, што да паходжаньня парафразаваць словы Оржэхоўскага: gente Alboruthenus sum, natione — Polonus! Праўду кажучы, мы ўсе, паўночныя рубежане, гэта самае аб сабе можам сказаць..." (59).

Далей аўтар у ваднэй з частых дыспут укладае ў вусны сэмінарыста Літоўца Борусаса гэткі зварот адносна Беларусаў: „А хто-ж не гарцаваў па нашым нібы жаўлаковым карку?!.. Ах, скажу вам, што нас заліваў і Беларус! Гэта сьцьверджаная гістарычная праўда! Праз Літоўскі Статут беларускі язык дастаўся ў судоўніцтва, адміністрацыю, загарнуў абшары на захад ад Вільні, а нам пакінуў нейкія павыкрыўляныя граніцы". —

— „Хто-ж вам вінават? — заўважыў іронічна Марцінкевіч, прототып сэмінарыста беларуса. — Прагарэлі, ня маеце адпорнасьці! Vae victis! — „Праўду кажаш! — стукнуўшы кулаком па стале — казаў Солюнас... Бяда нам ня ў тым, што мы пераможаныя, а ў тым, што мы сябе за такіх уважаем. А вось сяньня, як Сымэон, зачынаем аглядаць збаўленьне! І не ў пакорным цалаваньні царскіх папіхачоў, не ў чаканьні бяздзейным, не ў наварочваньні ўсходняй душы, але ў разьвіваньні ў сабе самастойнасьці, самапачуцьця і нацыянальнага духа! Vae victis! Гора вам, варшаўскім слугам! Вы пераможаныя! А мы ўжо перамагаем, бо ў нас жыве бунт. Бунт тварэц!... Ня верце, што будуюць ціхія... Не! Толькі тыя, што ўмеюць стварыць новую зару і жыць яе блескам! Зарой гэтай будзе незалежная Русь і Літва!" (69—70).

Прабываньне ў прыгожых Бірштанах над Нёманам жыва прыпомніла Альфрэду радзімы край. Праўда, няма ў яго яшчэ перадуманага нацыянальнага пагляду, дык якбы пярэчачы таму, што казаў раней, зрабіўшы гістарычную дыгрэсыю, аб мінуўшчыне Беларусі і аб яе сумным і прыгожым крайабразе, расчуляецца і кажа: ...„І цяпер чую сьлёзы ў вачох, бачачы абраз гэны. Хацеўбы вярнуцца да гэнага гнязда, гдзе сэрца жыло з прыродай, а людзі былі добрыя і лагодныя. Нажаль, вярнуцца туды не магу! Двор па сьмерці дзядькі прадалі, бо я, як каталік, спадкаберцам быць не магу. Праваслаўныя спадкаберцы спусьцілі бацькаўшчыну сялянам. Корчыцца маемасьць... Залівае царская авангарда і Паляка і Беларуса!"

„Калі падумаю, што беларускія дзеці, якія са мной гулялі, стопяць сваю гаворку з языком *валдайскіх ямшчыкоў,* чую вялікую крыўду, быццам адбірае хто ад мяне права гаварыць

папольску і пабеларуску. З расейскім языком украдзецца ў сэрцы рубяжан і ненавісьць да польскасьці. Можа прыйсьці час, што на грунце палітыкі, стоячы вока ў вока, адчуваць будзем разбежнасьць імкненьняў. Пашкадаванай тут будзе польскасьць і каталіцкасьць. З гэтым аднак не згаджаюцца са мной ані таварышы, ані знаёмыя. Занадта магутнай, кажуць яны, ёсьць наша культура і занадта вялікія ўплывы клеру, каб мог утрываліцца які сэпаратызм. І хто-ж лічыўся-б з некулькімі авантурнікамі! Аднак жа сумна мне, Божа!" (91—92).

Далей натуе Шыльлер дзіўнае зьявішча, што жывучыя на Беларусі стараверы, хоць паходжаньня вялікарускага, ужывалі на сяле, і пэўна ўжываюць цяпер, беларускай мовы. Відаць гэта з таго, што лазьня ў сераду робіцца на тое, як кажуць яны, „каб чэрці ня цешыліся", а ў суботу: „каб абмыць грэшнае цела" (92).

Доўгія зімовыя вечары па дварох на Беларусі запаўняліся галосным супольным чытаньнем кніжак, або — яшчэ часьцей — страшным расказам аб нападах ваўкоў, успамінамі з паўстаньня. Калі раз зайшла гутарка аб павешаных і расстрэленых, сталася здарэньне, каторае падаю тут у апавяданьні Шыльлера: „На маё пытаньне, за што? пан харужы адказаў: — за імкненьні да свабоды. Цётка шапнула яму: „нашто дзіцяці гаварыць аб гэтым?!" Харужы з абурэньнем сказаў пабеларуску: *Калі рабёнак ня будзе знаць, што гэта маскаль, а што паляк, то ніколі ня будзе кахаць роднай замлі.* Агулам беларускі язык у штодзеннай гутарцы быў ужываны нароўні з польскім. Служба знала абодва. Слухаючы гутарак на кухні, чуў я сказ: *паны зьбяднелі, прагарэлі.* Старая кухарка Сафея была тэй думкі, што *калі-б паны за картамі не сядзелі і за бабамі не ганялісь, тобы цар іх ня трогаў.* Стары Сенька, быўшы лясьнічы, часта сардэчна гаварыў мне: *Бедны панічок! што табе асталась? дзед быў багаты. Малісь... Адбярэш зямлю, што Мураўёў забраў!"*

„Не адчуваў я ненавісьці ў сялян ані да паноў, ані да Польшчы. Здавалася мне, што яны яшчэ не асвоіліся з скасаваньнем паншчыны і ўсьцяж клоняцца да двара. Усе вакалічныя сяляне радзіліся ў дзядзькі, жылі з ім у найлепшай згодзе, цалавалі яго (і мяне) у рукі і называлі мяне *панічок.* Забаўляўся я з сялянскімі дзяцьмі, як з прыяцелямі, і гаварыў з імі пабеларуску. .

Маё выабражэньне гадавалі і разьвівалі легенды валдайскія і беларускія. Расказвала мне іх 104 летняя Беларуска Мялюшчыха... Мела яна нязвычайны дар вобразнага апавяданьня прыкладнай беларушчынай. Ад яе так-жа чуў я песьні, каторых ніхто ўжо з'жывучага пакаленьня не пяе. Адна з гэтых песьняў-легендаў, з падкладам гістарычным, урэзалася мне ў памяць і дагэтуль распальвае выабражэньне сваей поэтыцкасьцяй, ёмкасьцяй выражэньня і казаўбы прарочай сілай напяцьця" (92—93).

Даўгаватай гэтай легенды паўтараць тут ня трэба. Даволі сказаць, што дышала яна вайной Рэчыпаспалітай польскай

з Масквой, а выступае ў ей апрача розных гістарычных асоб, так-жа юродзівы — дух Русі. Асновай гэтай легенды ёсьць інтуіцыйная тэза: „Як звон Зыгмунта ў Кракаве, так звон Івана Грознага ў Маскве не сальюцца ў вадзін голас, так Польшча з Масквою ня згодзяцца на супольнага караля“ (97).

Дагэтуль у повесьці забіралі голас выключна мужчыны, цяпер-жа даходзе да голасу і маладая інтэлігэнтная Полька Аўрэля. Паслухаўмо новай вакацыйнай дыскусіі: „Завязалася дужа ажыўленая гутарка на тэму здольнасьці двух народаў, што жывуць на ўсходніх рубяжох быўшай Рэчыпаспалітай. Аўрэля выказала знаёмасьць прадмету. Зьдзіўлены сэмінарыст, Альгерд, запытаўся: Якім спосабам дайшла пані да так канкрэтных вестак?

— „Асабістым стыкам з народам. Мала чытаць: трэба справу дасьледжваць на месцы! Затым так сьмела праводжу паралель між тыпам Беларуса і Літоўца. Беларус сонны, Літовец—павольны, але энэргічны; гэны ня вера ў вартасьць вынаходаў, — гэты разумее ўжо карысьць машын, мэліорацыі. А гэта ўсё дзякуючы кунігасу і конспірацыі вучыцелькі. Ксёндз нават растрыгае цывільныя справы, знаючы права звычаёвае, а народ падлягае яго аўторытэту, мінаючы суды каронныя з накінутым, чужым кодэксам. Гэткага ўплыву ксяндзы на Беларусі не асягнулі. Занадта блізка жывуць з дваром, які не патрабуе такой апекі, як селянін“...

— „Праўду пані кажаш, але ня сусім. Я такжа крыху знаю этнічную Беларусь. Беларускі двор нязвычайна зьвязаны ў пашыраньні польскасьці. Сабачы нос урядніка, звычайна праваслаўнага Беларуса, сьлядзіць ксяндза і пана, як хорт ці гончы. Ваколіцы з мяшаным насельніцтвам няпэўныя. Прынцыпова сяляне хіляцца... да двара, але яшчэ помняць указ скасаваньня паншчыны...

— „Аднак-жа бароцца трэба—сказала Аўрэля! Згаджаемся, што тут працаваць лягчэй. Элемэнт аднолькавы расова і рэлігійна — гэта сіла! І псыхіка іншая! Літовец любіць зямлю ня так утылітарна, як Беларус, што кажа — *каб зямелькі пабольш,* — але больш духова, бо зямля сьвятая!“.., (140—141).

Падчас вакацый, прабытых на радавітай Літве, у Амброзайцісаў, раз скарысталі з парафіяльнага сьвята, каб заімпровізаваць над роднай ліпой веча, на якім мелі забіраць голас некалькі сымпатыкаў літоўскай і беларускай нацыянальнай справы. Літоўцы, учасьнікі веча, наракаюць на тое, што „Літва-Русь зрабіла гістарычную памылку спалучэньня з чужапляменнай нам Польшчай. Мусім памылку гэту паправіць“... (155).

Другі ўзноў Літовец гэтак гаварыў: „Баючыся беспасрэднай стычнасьці гранічнай з Немцамі, Масква захоча мець Літву-Русь, пабратымчыя плямёны, што маюць палову праваслаўнага насельніцтва. А гэгемонію над гэтымі народамі: Беларусамі, Русінамі, над рэштай Палякоў мусім абняць мы: Літоўцы!“ (Там-жа). Іншы ізноў казаў: „нашто нам Русь! Даволі Літвы вялікай еднасьцяй

веры і языка!“ (161). Спольшчаны Літовец на гэта так рэплікаваў: „Толькі палітыка нашых грабароў палітычных магла выдумаць шалёную концэпцыю стварэньня Вялікага Княства Літоўска-Рускага паміж Расеяй і Польшчай! Гэта справа ясная!.. Хутчэй Эўропа адрэстаўруе Польшчу, як Літву-Русь і да таго пад гэгеможніяй Літвы“. (162).

Усё ў нас, што датычыла Беларусаў, было звычайна зводжана да справы бізантызму, як гэта відаць хацяжбы з гутаркі наступнай: „Польская культура мусіць падвоіць сваю чуйнасьць, каб зваяваць наступаючы на нас бізантызм“.

— „Праўду кажаш — заявіў Альф; ужо даўна ідзець барацьба на нашых землях, асабліва на ўсход ад Вільні... барацьба духавенства каталіцкага і праваслаўнага... За што? За душу гэтага беларускага народу“... (170).

Беларуская справа яшчэ вернецца ў повесьці, калі яе галоўны гэрой Альф знайдзецца ў Полацку, скуль вось гэтак напіша да свайго сэмінарыстага таварыша Альгерда: „Далёка мы адзін ад другога: я ў сэрцы паўночнай беларушчыны, у бацькаўшчыне Рагнеды, а ты на землях бацькаўшчыны Біруты. Аднак-жа чуемся дзяцьмі адной зямлі, каторай гісторыя запісана літарамі — крывавымі і някрывавымі. Што далей будзе пісацца? Няведама. У кожным выпадку будуць гэта нашы дзеі ў дальшым цягу, дзеі нашай адпорнасьці прад навалай бізантызму. Пішу да цябе, праняты думкамі: allora e oggi. Сяджу на руінах Горнага Полацкага Замку. Праступная воля наезьніка не апякуецца гэтымі рэліквіямі, што сьведчаць аб мінуўшай волі нашай“... (200).

Мінула трохі часу. Якраз мінаў год ад здарэньняў, каторыя так страсанулі ўсей Літвой. Надыход кражанскага працэсу выклікаў зацікаўленьне клеру палітычнымі справамі... Дыспуты ў сэмінарыі мелі цяпер характар рачовы, спакойны... Альф студыюе этнолёгію і гісторыю літоўска-польскіх адносінаў і зацікавіўся ён так-жа і лёсам Беларусаў.

„Была гэта першая заранка зацікаўленьня грамадзянства беларускай справай. Рух гэты вялі перадусім мінчукі. Альгерд так-жа зацікавіўся ім. Аб гэтым адбываліся доўгія дыспуты, на каторых абодва прыходзілі да пракананьня, што розная іх псыхіка клоніцца да розных сьветаў, да адменных формаў зьдзейсьненьня іх ідэолёгіяў“... (229—330).

Вышэйапісанае паказвае нам, як агулам выглядалі ў нас прапачаткі беларускай справы, асабліва на грунце каталіцкай духоўнай сэмінарыі ў Вільні. Ведама, гэта толькі ласкуты таго, што перадумалі і перадыскутавалі аб гэтым сэмінарысты, у душы каторых, ня гледзячы на варожае асяродзішча, жыла яшчэ лучнасьць з беларускім народам і з ягонай „простай“ мовай. Дзеелася ўсё гэта на гадоў колькі раней, як у мурох тэй-жа сэмінарыі знайшліся сьведамыя Беларусы ў сучасным разуменьні гэтага слова.

Др. СТ. ГРЫНКЕВІЧ

Аб праве да Бацькаўшчыны

Ёсьць балючыя праблемы, аб якіх грамадзкая апінія разважае неахвотна. Кожнае грамадзянства мае свае „непапулярныя" тэмы. Ёсьць іх нямала й ў беларускім жыцьці. Да аднэй з такіх тэмаў належыць пытаньне адносінаў нашых да Палякоў.

Гісторыя нашага Адраджэньня мае ўжо некалькі этапаў ў суадносінах двох народаў — беларускага і польскага, беручы найнавейшыя падзеі й не варочаючыся да далёкае гісторыі. Найбольш будуць тутака яркімі тры мамэнты: *даваенная пара да 1914 г., пара рэвалюцыі* ў Расеі ў 1917 г. і войнаў незалежнае ўжо дзяржавы польскае й наканец *падзеі ў незалежнай Польскай Рэспубліцы,* дзе складоваю часткаю лучылі й мы, Беларусы.

Пачаткі нашага Адраджэньня, трэба адцеміць, сустрэнулі, агульна беручы, адносіны нэўтральныя са стараны Палякоў, або нат даволі цёплыя. Рэакцыя гэная была абаснавана на вельмі рознаякіх умовах тагачаснага палітычнага ладу. Беларусы былі тады адным з тых дзейнікаў, з якім народы панявольныя ў Расеі маглі мець супольны шлях. Да таго-ж і *непалітычна* было-б глядзець варожа на адраджэньне Беларусаў, варожасьць гэная магла-б быць лёгка аружжам проці самых сябе.

Частка польскага грамадзянства зусім шчыра, бяз ніякіх падыходаў, вітала спробу загнанага народу знайсьці назад сваё імя ў гісторыі. Былі паміж гэнымі сымпатыкамі адзінкі рознаякія. Адныя па традыцыі йшлі за лёзунгам „вольныя з вольнымі", іншыя нават пачувалі ў сабе родны кліч; адным і другім імкненьні пачынальнікаў новае пары ў жыцьці беларускага народу былі зразумелыя; можна было ў іх толькі папытацца, чаму яны ня станулі супольна да змаганьня, чаму асталіся толькі сымпатыкамі? І шмат было такіх, што ня стрывалі, пачуўшы, што родныя гоні ажываюць і паклалі, хто колькі мог, працы пад фундаманты нашага Заўтра.

Нажаль, колькасьць іх ня была такая, як можна было-б чакаць, і якая была-б патрэбная згодна з палажэньнем беларускага народу. Вайна з усімі яе раструскамі, новымі аспэктамі палітычнага жыцьця, працерабіла рады і гэных адзінак. Захопленыя новымі магчымасьцямі польскімі, адны саромліва крыху, іншыя з пачуцьцём ахвяры, іншыя нічога не выяўляючы, пакінулі рады змагароў беларускіх. Шкада дзеля нас, шкада й дзеля іх самых.

Сяньня мо было-б яшчэ захутка шукаць адказу канкрэтнага на прычыну, чаму тыя людзі ад нас адышлі, ды чаму людзі з іх сфэры асталіся нам чужымі. Дасьледчыкі ў будучыне мецімуць магчымасьць падрабязна й абасновываючыся на дакумантах даць на гэныя пытаньні адказ.

Хаця гэта падзеі з апошніх амаль дзён, падзеі з канца вайны і рэвалюцыі, аднак тады людзі гэтак хутка жылі й працавалі, што неяк неспадзеўкі дзеля самых сябе, быццам нечакана, згледзілі, што нешта перамянілася ў іх і адышлі ад беларускага загону.

Крыўду мы зрабілі-б тым адышоўшым, шукаючы аднаго толькі выключна матыву ў іх, а мяноўна карыснасьці вузка матарыяльнае, імкненьня за гонарам ці славаю. Ня трэ' нам забывацца, што ўздойм рэвалюцыі выкінуў на верх новыя каноны, накінуў людзям іх міжвольна, што выйсьці з кругу катэгорыяў новага думаньня яны не маглі

Хто пачынаў Адраджэньне Беларусі? Ці можна казаць, што гэта былі выключна прадстаўнікі сялянства й работніцтва? Ці ў фундаманты вызвольнага руху былі пакладзены думкі клясавасьці й выключнасьці клясавае?

Калі сілаю фактаў паміж першымі рабачаямі на ніве беларускай бачым сыноў вёскі, то ўсё-ж такі ня трэ' забывацца, што нямала паміж імі было й тых сыноў народу, што радзіліся, калі й не ў палацах, дык прынамся ў том асяродзішчы, якое даўно парвала лучнасьць з гушчаром народу й адыйшло ад яго далёка.

Ці яны не маглі вярнуцца на ўлоньне народу? Ці мог ім гэтага нехта забараніць?

Яны прышлі, пачалі працаваць і гэтым пацьвярдзілі вялікую праўду, што кожны народ — гэта сялянства, работніцтва й яшчэ „н е ш т а“. Генае „нешта“ неканечна мае быць клясаю. Хачу тут падчыркнуць, што народ і кляса з сацыяльнага боку гледжаньня гэта паймы, якія стыкаюцца з сабою ды ніколі не супадаюць. Народ — гэта *сынтэза* ўсяго, бяручы гістарычна, ды нат у кожным актуальным разрэзе свайго жыцьця.

І вось вайна з рэвалюцыйным віхром скалыхнулі ў нас гладзь жыцьця і побач розных іншых сьледамкаў, вельмі добрых і вельмі благіх, накінулі нацыянальнаму жыцьцю аспэкт клясавасьці Яно праўда, што Беларусь „мужыцкая“, што стаіць на селаніне, гэта ужо факт гістарычны. Аднак гэта яшчэ не азначае, што сялянства — гэта Беларусь.

Падзеі нашыя пайшлі сваімі каляінамі, мінула рэвалюцыя, аджыў кліч „роўныя з роўнымі“. Ці было гэта шчыра, ці толькі гест, выкліканы іншымі плянамі, ня будзем уваходзіць. Адно толькі можна адцеміць, што яны ўжо былі „вольныя“, а мы асталіся паднявольнымі й хутка мы ня чулі ўжо аб „роўнасьці“.

Чарговыя дні, настроі маладога польскага вялікадзяржаўніцтва заганялі штораз больш на накінуты беларускаму Адраджэньню шлях выключнасьці народу-клясы. Толькі таўро (кляймо) паходжаньня з пад сялянскае страхі давала быццам права прызнавацца да беларускасьці.

І мы прывыклі да новага ладу. Часта на'т не ўяўляем сабе іншых магчымасьцяў, зусім быццам забываемся, што народ гэта ня толькі мы, а народ—гэта ўсенькае тое, што было, што народ ня толькі тое, што ёсьць, а й тое, што будзе!.. Але — скажа

нехта — нашто ламаць адчыненыя дзьверы, кожны хай прыходзіць у сьвятыню, дзе правіцца Служба вялікая ў імя Народу Беларускага.

На першы пагляд сказ слушны, шмат у ім праўды. Ніхто забараніць ня сьмее, калі брат заблудзіўшы й змадзеўшы зусім, варочаецца на загон бацькі свайго. Шмат цяжэй часта гаварыць з такім братам, які прыходзіць пышаючыся сваім багацьцем і новаю Бацькаўшчынаю, хаця ён там толькі заўсёды быў пры маком. І такога трэба прыняць, не адкідаць яго, ён хаця й бадзяўся па бездарожжы, то ён усё-ж такі наш, хай толькі пачуе ён родны загон, які загаворыць да яго сэнтымэнтам усяе мінуўшчыны.

Клікаць яго мы ня можам. Трэба аднак, каб ён ведаў, што прымем, калі схоча прыйсьці, і прымем сапраўды як роўнага з намі.

Ці гэткія магчымасьці павароту належаць да галіны сапраўднасьці?

Ужо маглі мы бачыць у жыцьці іншых народаў (Чэхі, Літоўцы), што выключнасьць клясавая, ці на'т толькі ідэолёгічная, шкодная дзеля паўніні жыцьця Народу. Не раней дык пазьней трэба варочацца й папраўляць памылкі гэткія, зробленыя ў мінуўшчыне. Паварот пазьнейшы на ўлоньне Бацькаўшчыны, калі яна ўжо загадае сваім заблудзіўшым сынам вярнуцца, не такі прыгожы. Лепш было-б і дзеля нас і дзеля тых ейных сыноў, а нашых братоў, каб хутчэй яны ўявілі, што Бацькаўшчына Беларусь іх жджэ й вітае.

АД. СТАНКЕВІЧ

Зацемкі аб П. Сяргіевічу і яго творстве

(з нагоды выстаўкі рысункаў і малярства)

Пётра Сяргіевіч — гэта адзін з найвыдатнейшых беларускіх мастакоў-маляроў у Зах. Беларусі. Імя яго ўжо шырока ведама ня толькі беларускаму грамадзянству.

Паходзіць П. С. з Браслаўскага пав., з в. Стаўрова. Радзіўся ў 1900 г. Бацькі яго незаможныя сяляне. Вучыўся сьпярша ў царкоўна-прыходзкай школе, у прытулку імені Мантвіла ў Вільні, у фабрычнай школе недалёка Стаўрова, у 1917 г. на тэхнічных курсах у Петраградзе пры фабрыцы грошаў, у 1920 г. запісваецца вольным слухачом у Віленскі Унівэрсытэт на аддзел мастацтва, у 1924/25 г. студ'юе ў Кракаве і ўрэшце ўзноў у Вільні, дзе ў 1928/29 г. канчае ўнівэрсытэт.



П. Сергіевіч „Падарожныя“

Пётра Сяргіевіч — гэта бязумоўны талент. Ведае аб гэтым ён сам і працуе, не пакладаючы рук, каб гэнага таленту не змарнаваць, ведае аб гэтым і беларускае грамадзянства, якое так часта з ягонага таленту карыстаецца для розных культурных мэтаў, ведае аб гэтым і іншае віленскае грамадзянства, якое сьлядзіць за культурным жыцьцём Вільні.

Шырэй даўся грамадзянству П.С. пазнацца, бяручы ўчасьце ў выстаўках „Związku Niezależnych Artystów - Malarzy“ ў Вільні (1933-34), у выстаўцы таго-ж „Związku“ й „Zachęcie“ ў Варшаве (1933) і ўрэшце ў самастойнай выстаўцы сёлета ў Вільні, з нагоды якой і пішам гэтыя зацемкі.

Гэтая выстаўка — першая самастойная — звалася выстаўкай рысункаў і малярства. Адбывалася яна ад 26. XII. 35 да 8. I. 1936 у памешканьні школы Т-ва Артыстаў Плястыкаў (Міцкевіча 7).

На выстаўцы было да сотні экспонатаў. З іх пераважалі працы алейныя і значны лік рысункаў, робленых сангвінай і вуглём. Тэматыка, форма і мастацкія спосабы творства П. С. рознародныя. Ёсьць кампозыцыі, партрэты, пэйзажы, студыі галоў і інш. У працах сваіх мастак наш прадстаўляе быт беларускага народу, малюе беларускую прыроду, а такжа адтварае беларускую мінуўшчыну, даючы абразы гістарычнага зьместу. З кампозыцыяў перадусім кідаюцца ў вочы вялікіх разьмераў абраз „Вясьляр“, які адважна, з сілай і разгонам, плыве праз усхваляваныя воды, надзейна імкнучыся да берагу, а такжа абраз „Артай“, які, наперакор няспрыяючым стыхіям прыроды, гоніць баразну за баразной, перакананы, што працай усё пераможа, вялікіх спраў даканае.

З абразоў, што малюе беларускі быт, заслужваюць на ўвагу „Калыска“, „Залёты“, „Сялянскае падворышча“ і інш.

Абразом гістарычнага зьместу, узорам эпіцкага творства, вобак з „Усеславам“ зьяўляецца „Каліноўскі“, абраз разьмерамі найбольшы за ўсе іншыя, яшчэ крыху нявыканчаны. — Лес. Грамада сялян. Пасярэдзіне К. Каліноўскі — у сьвітцы, малады, энэргічны, з агнем у вачах прамаўляе аб патрэбе барацьбы з царом. Гледзячы на гэты абраз, здаецца чуеш, як слаўны „Дыктатар Літвы“ ў беларускай мове граміць царскую тыранію над Краем, заклікае сялян да барацьбы за зямлю й волю, як прадстаўляе сьветлы ідэал незалежнасьці „Вялікага Літоўскага Княства“, у якім усе народы будуць вольныя, шчасьлівыя, у якім панаваць будзе праўда і справядлівасьць.

Творчыя магчымасьці П. С. дужа шырокія. Прабуе ён свайго памазка і алоўка так-жа й у галіне малярства рэлігійнага. І на гэтай ніве ён можа ўжо шмат чым пахваліцца. У касьцеле ў Солах, Ашмянскага павету, мастак наш намаляваў 34 вялікія абразы, а так-жа цэлы рад абразоў і фігур у прэзбітэрыі і ў сярэдняй наве касьцёлу ў мястэчку Корац, Роўненскага павету, на Валыні.

На мой пагляд — найбольшай заганай творства П. С. — гэта яго часта нявыканчанасьць, недахоп мастацкай прэцызыі. Ведае аб гэтым і сам мастак; ведае, разумее і працуе ў кірунку перамогі гэтай сваей слабасьці. Пазытыўныя вынікі яго пад гэтым узглядам працы — ўжо яўныя. Выстаўка рысункаў і малярства, аб якой тут гаворым, абымала працы П. Сяргіевіча за пяць гадоў (1930 – 1935). Вось-жа, хто бачыў яго творства пяць гадоў таму і параўняў яго з творствам апошняга часу, той ясна бача, як Сяргіевіч „вырас“, як шмат ён зрабіў між іншым і ў кірунку выканчанасьці сваіх абразоў, у кірунку іх мастацкай прэцызыі.

На выстаўцы можна было пачуць галасы, што аддзел мастацтва ў Віленскім Унівэрсытэце Пятру Сяргіевічу шмат даў, асабліва ў галіне тэхнікі, але ня даў тэй шырокай магчымасьці выяўляньня свайго буйнага таленту, якую яму дала-б заграніца з яе вялікімі мастакамі, з яе шэдэврамі.

Пэўна-ж, гэта ўсё шмат памагло-б нашаму мастаку. І калі-б была нагода, дык трэба было-б яе выкарыстаць. Але пакуль надзеі на паездку заграніцу няма, астаецца П. Сяргіевічу ў краі шукаць магчымасьцяў усестаронна выявіць свой талент. А гэтыя тут магчымасьці прадусім дзьве: праца, студыі.

Ёсьць спробы залічыць П. Сяргіевіча з яго мастацкім творствам да прадстаўнікоў так зван. „szkoły wileńskiej regjonalnej“. Дарэмна. Ад гэтай школы ён незалежны; ён ідзе сваей незалежнай, беларускай дарогай, ён тыповы мастак беларускі.

Кнігапіс

И. И. ЛАППО: Литовскій Статутъ 1588 года.

Том I. Изслѣдованіе. Часть первая.

Kaunas, 1934, бач. XVI + 476.

Аб Літоўскім Статуце існуе ўжо даволі багатая літаратура. Пісалі рускія і польскія вучоныя, а ў апошнім часе, з ростам і пашырэньнем нацыянальнай сьведамасьці сярод Беларусаў, Літоўцаў і Украінцаў, пачалі займацца навуковым досьледам і вывучэньнем гэтага вельмі цікавага гістарычнага помніка беларускія, літоўскія і украінскія вучоныя.

Агульны падрахунак і ацэнку ўсёй дацяперашняй гістарычнай літаратуры, якая прысьвечана Літоўскаму Статуту, знаходзімо ў працы У. Пічэты, выдатнейшага гісторыка Беларусі, першага рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску: „Распрацоўка літоўска-беларускага права XV—XVI стагодзьдзяў у гісторыяграфіі" („Полымя", Менск, № 8 за 1926 і № 2 за 1927). У. Пічэта ўважае, што сапраўднае навуковае вывучэньне Літоўскага Статуту яшчэ толькі пачынаецца. І нельга з гэтым не пагадзіцца: ў дацяперашняй гістарычнай літаратуры нагрмаджана ёсьць столькі розных супярэчнасьцяў у пастаноўцы і вырашэньні пытаньняў аб узьніку Літоўскага Статуту, што прыходзіцца ўсё пачынаць спачатку, трэба ўздымаць цаліну, каб выкрыць і выявіць гістарычную праўду. Гэта мабыць і мае на ўвазе І. Лаппо, калі ўважае патрэбным адзначыць, што ў сваей працы ён рад пытаньняў, зьвязаных з Літоўскім Статутам, вырашае іначай, чымся гэта ёсьць прынята ў гістарычнай літаратуры (бач. VIII).

Першае і аснаўное цьверджаньне аўтара палягае на тым, што Трэці Літоўскі Статут зьяўляецца завяршэньнем кодыфікацыйнай працы, якая адбывалася ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI стагодзьдзі, зьяўляецца тым зборам законаў, з якім Вялікае Княства Літоўскае перажыло эпоху злучэньня з Польшчай паводле Люблінскай вуніі 1569 г. Статутовае права, за вынятка м з яго констытуцыйных законаў Вялікага Княства Літоўскага, перажыло падзел злучанай Польска-Літоўскай Рэчыпаспалітай і заставалася дзейным правам пасьля далучэньня да Расіі аж да 1840 году; у значнай меры было прынята і расейскім законадаўствам (бач. VI).

Вось-жа: І. Ляппо рашуча запярэчывае распаўсюджаны ў гістарычнай літаратуры пагляд, што Вялікае Княства Літоўскае перастала існаваць, як самастойная дзяржава, пасьля падпісаньня акту Люблінскай вуніі. Сваё цьверджаньне аб дзяржаўнай самастойнасьці Вялікага Княства Літоўскага пасьля Люблінскай вуніі абапірае на гэткіх фактах: 1) Вялікае Княства Літоўскае было прыведзена да Люблінскай вуніі проці яго волі, таму і ўмова аб вуніі павінна быць прызнана не дабравольнай, а змушанай; 2) Вялікае Княства Літоўскае захавала паводле Люблінскай вуніі свой дзяржаўны тытул, свой асобны ўрад, усе свае дзяржаўныя прывілеі сваіх станаў; умова аб вуніі 1569 году не зьлівала Вялікае Княства Літоўскае з Польшчай у адну унітарную дзяржаву, але ствapала іх фэдэрацыйны саюз, у якім фэдэрацыйнай уладаю для абедзьвух дзяржаў зьяўляўся супольны кароль і аб'еднаны сойм і сэнат; супярэчнасьці ўнутры самога акту Люблінскай вуніі, як і тыя абставіны, у якіх ён быў падпісаны, ня толькі не ўнясьлі прымірэньня ў адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай, але яшчэ больш абвастрылі іх узаемную нездаволенасьць; 3) умова аб Люблінскай вуніі зьяўляецца міжнародным актам; 4) гэта ёсьць акт недасканалы і ўнутрана супярэчлівы, але найбольшы яго дэфэкт у тым, што зусім не ўстанаўлівае ўзаемнаадносіны абедзьвух дзяржаваў у часе бескаралеўя (бач. 277—289).

Цьверджаньне І. Ляппо аб тым, што Вялікае Княства Літоўска-Беларускае ня страціла сваей дзяржаўнай самастойнасьці пасьля падпісаньня акту Люблінскай вуніі 1569 году ня ёсьць новае: у беларускай гісторыяграфіі гэта пытаньне ўважаецца вырашаным і не выклікае ніякіх сумліваў. Дакладны і ўсебаковы разгляд гэтага пытаньня знаходзімо ў працы В. Друшчыца: „Палажэньне Літоўска-Беларускай дзяржавы пасьля Люблінскай вуніі" („Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску", Менск, 1925, № 6-7, бач. 216—251).

Новае і сапраўды цэннае ў працы І. Ляппо ёсьць тое, што ён сабраў дужа многа фактычнага матарыялу аб паходжаньні Літоўскага Статуту, асабліва да гісторыі яго направы — другой і трэцяй рэдакцыі (1566 і 1588 году); гэта ёсьць плодны вынік яго 22-х гадовай працы. Але нельга не адзначыць, пры гэтым, што ў монографічнай працы І. Ляппо аб Літоўскім Статуце, як і ў ліку іншых яго гістарычных прац аб В. К. Літоўскім, увесь сабраны ім фактычны матарыял падлягае такой ідэолёгічнай апрацоўцы, такой сыстэматычнасьці і стылізацыі, што, нарэшце, зусім нават губляецца лёгіка фактаў і поўнасьцю замяняецца сваеасаблівай лёгікай суб'ектыўных уяваў аўтара.

У аснову направы Статуту 1529 году, кажа Ляппо, палажана была ідэя шляхэцкай вольнасьці: шляхціц ёсьць вольны чалавек, які жыве на кошт сваей „аселасьці" і нясе павіннасьці дзеля абароны дзяржавы ад вонкавай небясьпекі. Галоўныя крыніцы направы былі дзьве: судовая і адміністрацыйная прак-

тыка ўрадаў В. Кн. Літоўскага і чужаземнае заканадаўства. Лаппо крытычна ўзіраецца, пры гэтым, на вельмі пашыраны ў гістарычнай літаратуры пагляд аб выключным уплыве польскага законадаўства. В. Кн. Літоўскае ня жыло ізалявана ад вонкавага сьвету. Яго зьвязкі з культурным сьветам сягалі далёка на Захад і на Усход. Маглі быць розныя ўплывы. На першым мейсцы ставіць уплыў рымскага права: гэта адбывалася ня толькі спосабам уплываў канонічнага права і нямецкага гарадзкога права, але таксама і непасрэдна, бо нямала ў той час было ў В. Кн. Літоўскім адукаваных людзей, якія атрымлівалі асьвету ў замежных унівэрсытэтах, дзе мелі змогу дакладна і ўсебакова пазнаёміцца з рымскім правам, як у тэорыі, так і на практыцы. Апрача таго мела ўплыў грэка-рымскае права, якім кіравалася праваслаўная царква ў В. Кн. Літоўскім. Вялікае значэньне мелі таксама ўзаемаадносіны В. Кн. Літоўскага з Чэхіяй і Нямеччынай. Усё гэта разам перэтварылася ў Трэцім Статуце ў нацыянальнае права В. Кн. Літоўскага (бач. 134).

Але што ляжала ў яго аснове, з якіх карэньняў вырастала гэта нацыянальнае права В. Кн. Літоўскага?

І. Лаппо зьвяртае ўвагу на звычаёвае права, якое глыбока ўпілося ў народнае жыцьцё і выяўлялася ў судовай практыцы нават у часе дзейнасьці Другога і Трэцяга Статуту, але адзначае пры гэтым, што гэны звычай ня быў адзін і той самы на ўсіх землях В. Кн. Літоўскага: побач з літоўцамі жылі беларусы і украінцы. Якому з гэтых трох народаў належыць Літоўскі Статут, як нацыянальнае права В. Кн. Літоўскага? — Гэта пытаньне рубам ставіцца ў сучаснай беларускай, літоўскай і украінскай гістарычнай літаратуры. Лаппо, аднак, ухіляецца даць выразны адказ на гэта пытаньне, але ўкосна робіць пробы разьвязаць і гэты складны вузёл, які пакінула нам у спадчыну гісторыя.

У расейскай гісторыяграфіі істнуе пагляд, што ў аснове Літоўскага Статуту ляжыць старое рускае права. Лаппо гэтаму не пярэчыць і абяцае нават, што ў другой часьці сваей працы ён дасьць падробнае высьвятленьне, як і ў якой меры ўплывала гэна старое рускае права на ўзьнік Літоўскага Статуту. — На першы пагляд, маўляў, можа здавацца, што Трэці Літоўскі Статут зьяўляецца кодэксам Беларуска-Літоўскай дзяржавы, таму, што пасьля Люблінскай вуніі ў склад В. Кн. Літоўскага не ўваходзілі ўжо украінскія землі. Але межы гэнай дзяржавы пасьля 1569 году далёка не супадалі з этнографічнымі межамі разсяленьня „южной и западной ветвей русскаго народа, т. е. малоруссовъ-украинцевъ и бѣлоруссовъ". Такім чынам, уважае Лаппо, і паводле тэрыторыі, на якую пашыралася моц Літоўскага Статуту, нельга назваць яго кодэксам якой небудзь аднэй „южной или западной ветви русскаго народа". Нельга ўважаць яго так яшчэ і дзеля таго, што „старое русское право, легшее въ его основу, было пра-

вомъ, вырабатывавшемся на протяжении всѣхъ русскихъ земель, которыя въ себя вобрало Великое Княжество Литовское“ (бач. 135—136).

Лаппо імкнецца даказаць, такім чынам, што Літоўскі Статут, маючы ў сваей аснове „старое русское право“, зьяўляецца нацыянальным кодэксам „русскаго народа“. Але ўзьнікае пытаньне: што маемо разумець пад гэтым крылатым словам: „старое русское право“? Гэта паняцьце вельмі часта сустракаецца ў рускай гісторыяграфіі, ужывае яго і Лаппо, але, пакольні ведама, ніхто яшчэ ня даў належнага тлумачэньня яго канкрэтнага зьместу: ужываецца як нейкая мэтафізычная ўява. Трэба, аднак, спадзявацца, што ў другой часьці працы Лаппо „Литовскій Статутъ 1588 года“, якая ў незабаве мае выйсьці з друку, знайдземо адказ на гэта пытаньне, бо ў праціўным выпадку ў нішто распадзецца ўся яго складная будоўля гісторыі ўзьніку Літоўскага Статуту.

Др. Т. Грыб.

Гістарычна-Археолёгічны Зборнік № 1. Выд. Інстытуту Беларускае Культуры. Менск 1927 г., бач. 389.

Хоць з вялікім спазьненьнем, але усё ж такі на некаторыя менскія выданьні, якія мы нядаўна атрымалі, трэба кінуць вокам і зрабіць хоць кароткую рэцэнзію. Кніга, аб каторай пішам, ёсьць яшчэ „нацдэмаўская“, дык у ёй знаходзім яшчэ сапраўды шырокі навуковы сьветагляд, пазбаўлены вузкага, партыйнага марксізму.

Зборнік гэты, прысьвечаны гісторыі і археолёгіі Беларусі, вышаў, нажаль, толькі адзін (№ 1), пасьля выходзілі працы, прысьвечаныя выключна археолёгіі; аб першых двух томах мы пісалі ў кніжцы 4-ай „Калосься“, аб трэцім пішам у гэтай кніжцы далей.

Зборнік, аб якім ідзе гутарка, прадстаўляецца вельмі паважна і лікам тэмаў і іх апрацоўкай. Зьмешчаны там працы такія:

М. Доўнар-Запольскі. Социяльна-экономічная структура Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XVI—XVIII ст.

М. Шчакаціхін. Орнамэнтальныя роспісі сьмядынскай Барысаглебскай царквы ў Смаленску.

М. Доўнар-Запольскі. Да юбілею беларускага кнігадруку. Аўтар асьвятляе эканамічны грунт, на якім паўстала гэтакае буйнае беларускае пісьменства і беларускі друк у XVI ст.

У. Пічэта. Гаспадарскія (вялікакняскія) двары ў заходніх воласьцях Беларусі пасьля рэформы Жыгімонта-Аўгуста.

З. Даўгяла. Магілеўскае „брацтва прасалаў“. Прасал — даўнейшае беларускае слова, якое азначала дробнага гандляра, які вазіў сваю краму на вазе і гандляваў па вёсках і мястэчках. (Расейскае слова „прасол“ азначала прадаўца солі, а так-жа прасоленай рыбы, мяса і г. д.). Гэткія „прасалы“ ў XVII ст. мелі ў Магілеве сваё „брацтва“ і свой „парадак“ (статут), пісаны пабеларуску, тады, калі буйнае купецтва ў Магілёве мела ў той час „парадак“ пісаны ўжо ў польскай мове.

З. Даўгяла. Урадавыя адносіны да ўнітаў на Меншчыне ў часы Паўла I.

А. Бурдзейка. Нарыс соцыяльна-экономічнага жыцьця места Наваградку ў XVI ст.

А. Ляўданскі. Нэолітычныя стаянкі ў Смаленскай губ.

І. Сербаў. Археолёгічныя раскопкі ў аколіцах Менску ў 1925 г.

К. Палікарповіч. Нэолітычная стаянка каля балота Печанеж на Калінішчыне.

В. Дружчыц. Беларускія месты ў гістарычнай літаратуры.

І. Хозераў. Да пытаньня аб Спасаўскай царкве ў Полацку.

П. Харламповіч. Праскія грашы ў беларускіх манэтных скарбах.

П. Харламповіч. Манэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага Дзяржаўнага Музэю

Далей ідуць „Varia", паміж каторымі ёсьць так-жа вартасныя даведкі, як Дружчыца: Да пытаньня аб мове Літоўскага Статуту; З. Даўгяла: Знаходка палеолітычнай стаянкі ў Беларус; С. Дубінскі: Раскопкі Банцараўскага гарадзішча каля Менску ў 1926 г. і іншыя.

Паміж „Varia" мы зьвярнулі ўвагу на першы артыкул В. Дружчыца пад заг.: „Да пытаньня аб мове Літоўскага Статуту". Хоць гэты артыкул друкаваны быў ужо дзевяць гадоў таму, то усё-ж такі ён ня страціў сваей актуальнасьці і цяпер. Скіраваны ён проціў украінскага захопніцтва, якое імкнецца прысвоіць памяткі беларускай культуры сабе. Як ведама, некаторыя украінскія пісьменьнікі і дзеячы хочуць правесьці ў навуцы пагляд, што пісьменства ў даўнейшым В. Княстве Літоўскім было украінскае і што нават ведамы Літоўскі Статут зьяўляецца памятнікам украінскага права ня толькі з боку яго зьместу, але і мовы. Справа ў тым, што яшчэ ў 1923 годзе выйшаў „Науковий Збірнік Українського Унівєрсітету в Празі", т. I, у каторым праф. Р. Лашчэнка зьмясьціў артыкул: „Літовский Статут як памятник українського права". У гэтым артыкуле праф. Лашчэнка цьвердзіць, што Літоўскі Статут нават у сваёй трэцяй рэдакцыі з 1588 году ёсьць памятнікам украінскага права. На гэта яму адказвае В. Дружчыц, што калі першая рэдакцыя з 1529 году і другая з 1566 г. зьяўляюцца аднолькава памятнікамі як беларускага, так і украінскага права, то зусім іншае палажэньне займае Статут з 1588 г. У склад камісіі, якая была ўтворана для складаньня III-га Статуту яшчэ на Люблінскім Сойме, не ўвайшлі ні польскія ні украінскія прадстаўнікі. Дружчыц сьцьвярджае, што Статут 1588 г. зьяўляецца сапраўднай і грунтоўнай канстытуцыяй Літоўска-Беларускага княства пасьля Люблінскай вуніі (г. зн. пасьля 1569 г.). Статут значна папраўляў пастановы гэтай вуніі, а некаторыя артыкулы і зусім скасаваў. Як дзяржаўная канстытуцыя, Статут зусім не падходзіць да таго палітычнага палажэньня, якое ў той час займала Украіна, будучы аднэй з правінцыяў Польскай Рэспублікі, так як зямля Серадзкая, Каліская ці якая іншая, тады калі Літоўска-Беларускае княства мела сваю аўтаномію і свой Статут.

На якіх-жа навуковых довадах апіраецца праф. Лашчэнка?

навуковых довадаў, асабліва філёлёгічных, ён і не падае, а ў сваім цьверджаньні грунтуецца на тым, што мова Літоўскага Статуту названа мовай „рускаю", („а писар земский маеть по руску литерами и словы рускими вси листы, выписы и позвы писати, а не иншым языком и словы" (Статут 1588 г. раз. IV, арт. 1), а як словы „Русь", „рускі" першапачаткова ўжываліся ў Кіеве, праф. Л. робіць вывад, што моваю Статуту ва ўсіх трох рэдакцыях была мова украінская! Вось-жа Дружчыц выказвае, што слова „рускі" ўжывалася тады ня толькі на азначэньне мовы і народу украінскага, але і беларускага і што такія вялікія моваведы, як акад. А. Шахматаў, Буслаеў, Сабалеўскі, Уладзімераў, Карскі, прызнаюць, што ў В. Княстве Літ. беларуская мова была мовай дзяржаўнай і залічаюць Статут у лік памятнікаў беларускага а не украінскага пісьменства. Да беларускага пісьменства залічаюць Літоўскі Статут нават некаторыя ўкраінскія вучоныя, як напр. Дарашэнко ў кнізе „Славянський світ в його мінулому і сучасному" (Бэрлін, 1922 г., т. I). Усё гэта аднак не перашкодзіла праф. Лашчэнку „анэктаваць" г. зв. Літоўскі Статут да украінскага пісьменства.

Ад сябе дададзём, што пасярод украінскіх навуковых і палітычных дзеячоў дагэтуль было многа такіх, якія „анэктавалі" ня толькі беларускае пісьменства, але і ўсю паўдзённую Беларусь па Беласток, Лунінец, Бабруйск і Гомель, чым рабілі вялікую моральную крыўду беларускаму народу. Цяпер аднак мы з вялікай радасьцю сьцьвярджаем, што пасярод украінскага грамадзянства можна заўважыць адносіны да нас болей справядлівыя. Маем тут на думцы артыкул А. Курдыдыка ў „Шляху Нацiі" (№ 1. 1936 г.), дзе паважаны аўтар, пазнаёміўшыся ў Вільні з беларускім жыцьцём асьвятліў гэтае жыцьцё з вялікай прыхільнасьцяй і нават сэнтымэнтам, чаго мы дагэтуль у ўкраінскай прэсе не спатыкалі. Праф. Лашчэнка і А. Курдыдык — гэта вялікі этап украінскай грамадзкай думкі у адносінах да Беларусаў, этап у кірунку да лепшага... *В. Г.*

Працы Сэкцыі Археолёгіі. Том III. Беларуская Акадэмія Навук. Інстытут Гісторыі. Менск, 1932. 260 бач. in 4-o.

Гэты III том ёсьць працягам двух першых і таксама, як два першыя, ёсьць багаты зьместам *). У ім ёсьць такія навуковыя артыкулы:

1. А. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў Смаленшчыне.
2. Н. Дэбец. Чарапы Люцынскага магільніка і старажытных славян Беларусі і месца апошніх у палеантраполёгіі Усходняй Эўропы.
3. В. А. Рыбакоў. Радзімічы.
4. К. М. Палікарповіч. Палеоліт на рэчцы Судасьці (вадазбор Дзясны).
5. К. Фляксбэргер. Зёрны з Банцараўскага гарадзішча пад Менскам.

*) Аб першых двух томах гл. рэцэнзію у кн. 4 „Калосься" 1935 г.

6. К. М. Палікарповіч. Знаходкі рэштак чацьвярцёвай фаўны на тэрыторыі БССР.
7. А. Зьм. Каваленя. Археолёгічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Уцяж-Бук і Лукомкі.
8. Анат. Рынейскі. Археолёгічныя разьведкі на р. Пціч.

Апроч гэтага ў томе знаходзяцца яшчэ апрацаваныя наступныя тезісы да І-га Усесаюзнага Зьезду археолёгаў і этнографаў у Ленінградзе:

1. А. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў БСРР пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі.
2. К. М. Палікарповіч Палеоліт і мэзаліт БССР і некаторых суседніх краін верхняга Падняпроўя.
3. Акад. Н. М. Нікольскі. Этнографія ў БССР пасьля Кастрычніка.
4. М. Я. Грынблят. Вывучэньне раёнаў малага рыбалоўства і рыбацкіх арцеляў.
5. Акад. Н. М. Нікольскі. Пытаньне аб вывучэньні мотываў клясавай барацьбы ў фальклёры.

Апроч гэтага ёсьць багатая хроніка археолёгічных прац у БСРР, рэцэнзіі і гэографічны паказьнік. У кніжчы ёсьць арх. карта был. Рослаўскага павету (Смаленскай губ.) і карта расьсяленьня радзімічаў і суседніх плямёнаў (пры артыкуле Рыбакова „Радзімічы“).

У гэтым III цім томе ёсьць яшчэ адно, чаго няма ў папярэдніх тамох: змаганьне з нацыянал-дэмакратызмам. А. Ляўданскі у сваім тэзісе: „Археолёгічныя досьледы ў БСРР пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі“ востра выступае проціў быццам нацдэмаўскага кірунку ў археолёгічных досьледах ранейшага кіраўніцтва Бел. Акадэміі Навук. Ляўданскі цьвердзіць, што цяперашняя праца Сэкцыі Археолёгіі выразілася паміж іншым „ва ўмоцненым імкненьні працаўнікоў Сэкцыі да аўладаньня марксызска-ленінскай мэтодолёгіяй і дапасаваньня апошняй у сваей навукова-дасьледчай рабоце“. Мы вельмі сумняваемся, ці ў археолёгіі паможа нешта мрксызска-ленінская мэтодолёгія, а пашкодзіць дык можа. На наш пагляд навука павінна быць навукай і толькі яна павінна *сьцьвярджаць факты, выкрываць прычынную сувязь паміж імі і падаваць гэтыя факты да публічнага ведама* бяз ніякага нацягваньня на такія ці іншыя грамадзкія ці палітычныя кірункі. Маючы аб'ектыўныя факты, кожны вучоны зможа выбраць для сябе патрэбныя матар'ялы і абапёрці на іх сваю тэорыю. А ідэолёгічная прадузятасьць можа зьвярнуць археолёгічныя досьледы, якія у БССР ужо зрабілі вялікі поступ і паставілі беларускую археолёгію нараўне з археолёгіяй іншых народаў.

Апроч гэтага добра было б дзяржацца ў выдаваньні археолёгічных працаў аднолькавага кніжнага фармату, бо калі І-шы том выпушчаны ў сьвет у фармаце сярэдняй васьмёркі, то III-ці том in 4-о. Найлепшым фарматам для такіх прац быў-бы, здаецца, фармат II-га тому (вялікая васьмёрка). *В. Г.*

Ад. Станкевіч. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня 1935, выдавецтва „Шляху Моладзі“, фармат 8⁰, 128 бач.

Няўтомны працаўнік на ніве беларускае культуры кс. Ад. Станкевіч усьцяж узбагачывае наш культурны даробак сваімі цэннымі працамі пераважна гістарычнага характару. Да гэтых працаў належыць і вышэй успомненая, азначаная аўтарам, як „агульны нарыс, які беларускім гісторыкам можа паслужыць матар'ялам і плянам да апрацаваньня поўнай беларускай вызвольна-палітычнай гісторыі“.

У прадмове аўтар зазначае, што квэстыя беларускага палітычнага вызваленьня даўно яго цікавіла, але ня было магчымасьці выдаць працу друкам аж да 1934 г., у якім яна пачалася друкавацца ў „Шляху Моладзі“; друкаваньне трывала два гады. Аўтар абмяжаваўся ў працы да „выказаньня галоўных мамэнтаў з гісторыі беларускай палітычна-вызвольнай думкі і барацьбы, а такжа да выказаньня генэзы, вытокаў ідэі сувэрэннай незалежнай Беларусі і да агульнага апісаньня спробаў зьдзейсьненьня гэтага ідэалу“. Перад чытачом адчыняецца ўзрост народнай сьведамасьці ад канца XVIII стаг. у Еўропе агулам і беларускай у прыватнасьці. Першым пачынальнікам беларускага палітычнага вызваленьня аўтар лічыць Кастуся Каліноўскага, прыхільніка ідэі фэдэрацыйнай лучнасьці беларуска-літоўскіх земляў з Польшчай. Фэдэрацыя гэта мелася быць толькі вольным саюзам незалежных дзяржаваў. Думку Каліноўскага па яго сьмерці снаваў Ігнат Грынявіцкі, беларускі народнік, які быў „неразарвальным злучвом вызвольнай беларускай традыцыі між Каліноўскім і яго „Мужыцкай Праўдай“ і між „Гоманам“. Аўтар падрабязна спыняецца над аналізам палітычнага кірунку „Гоману“, а яшчэ раней „Муж. Пр.“, і з сынтэтычнага параўнаньня між імі, даходзіць да вываду, што „Гоман“ быў далёка бліжэй да зразуменьня беларускага нацыянальнага прынцыпу, чымся „М. П.“, якая ад паняцьця беларускага народу, як нацыі, была далёка. Далей аўтар спыняецца над асобай Фр. Багушэвіча, і кажа, што ён ласьне зрабіў рашучы пераломны шаг у падыходзе да беларускага нацыянальнага пытаньня. Багушэвіч, кажа аўтар, скончыў назаўсёды з беларуска-польскім народніцтвам Каліноўскага і з народніцтвам беларуска-расейскім гоманцаў, а стварыў народніцтва беларускае нацыянальнае, і паказаў самастойныя дарогі беларускага нацыянальнага адраджэньня агулам і нацыянальна-палітычнага вызваленьня. Годнага спадкаберніка нацыянальнага беларускага народніцтва Багушэвіча аўтар бачыць у Адаме Гурыновічу. Узбуджаная Фр. Багушэвічам думка беларускага адраджэньня на прынцыпе беларускае нацыянальнасьці не заглохла і сталася асновай беларускага арганізацыйнага культурна-палітычнага жыцьця, а ў сувязі з падзеямі, што стварыліся ў выніку сусьветнае вайны, сталася фундамантам для пабудаваньня ідэі сувэрэннай Беларусі, выражанай у акце з дня

25. III. 1918 г., і спробаў зьдзейсьненьня гэтага ідэалу, разглядам чаго і канчаецца праца.

Пастаўленае сабе заданьне аўтар бязумоўна споўніў. Дадатныя староны працы (а іх ёсьць шмат) кідаюцца аж надта чытачу ў вочы і дзеля недахопу месца ня будземо над імі спыняцца. Адцемім толькі некаторыя няточнасьці, якія пры студыяваньню гэтай працы даюцца спасьцерагчы.

Аўтар памылкова глядзіць на Люблінскую вунію, як на палітычную і культурную сьмерць беларускага народу, пасьля якой народ „апынуўся пад Польшчай ужо не як палітычна самастойны, але як яе падданы" (бачына 9). Сутнасьць Люблінскае вуніі ў тым, што Вял. Кн. Літ. і Карона (Польшч) у аднолькавай ступені зракаліся некаторых сваіх сувэрэнных правоў на карысьць новага палітычнага твору—супольнае Рэчыпаспалітае, але ніколі ня было так, каб беларускі народ, або дзяржава, стаўся *„падданым" Польшчы.* Калі-б тут і казаць аб залежнасьці палітычнай беларуска-літоўскай дзяржавы, дык толькі адносна да супольнае Рэчыпаспалітай, але ніколі не да Польшчы (Кароны), якая сама знаходзілася ў гэткай-жа залежнасьці ад новага твору. Іншая рэч, што фактычная перавага Польшчы (Кароны) пад кожным і асабліва культурным паглядам давяла ў канцы да палітычнага і культурнага заняпаду беларускага народу.

Памылковым ёсьць такжа і пагляд аўтара на ролю рэлігіі і царквы ў беларускім культурна грамадзкім жыцьці XVII і XVIII стаг. Ролю гэту аўтар малюе надта дадатна і нават у рэлігіі бачыць адзіную грамадзкую вартасьць, каторая зьберагала беларускую нацыю і тварыла беларускую культуру ў часы найвялікшага яе заняпаду. Згаджаемся, што беларускі народ у той час быў рэлігійны, але ласьне рэлігійныя адносіны XVII і XVIII стаг. былі аднэй з найвялікшых прычынаў аканчальнага яго заняпаду. Трэба мець наўвеце, што г. зв. „народнага касьцёлу", ня гледзячы на спробу, беларускі народ не стварыў, а тыя рэлігіі, што найбольш былі распаўсюджаны на Беларусі — праваслаўе, вунія, р.-каталіцтва — найменш баранілі вартасьцяў і культуры беларускага народу і нават яго існаваньня. Ня трэба забывацца, што ў змаганьнях між сабой праваслаўе і вунія клікалі на дапамогу вонкавыя палітычныя сілы (вунія—Карону, праваслаўе—Маскву), каторыя помач давалі, але перадусім не забываліся аб сваіх інтарэсах, дыямэтральна процілежных з інтарэсамі беларускага народу. Дасьледываючы дзейнасьць гэткіх выдатных асобаў таго часу, як Сматрыцкі, Кунцэвіч і ін., ад якіх у першую чаргу трэба было спадзявацца беларускага палітычнага розуму, паміма волі кідаецца ў вочы, што яны дзеля правядзеньня сваіх рэлігійных прынцыпаў найменш былі склонны рахавацца з інтарэсамі беларускага народу і дзяржавы. Пэўне-ж, што праваслаўе да барацьбы з вуніяй, і вунія пасьля перамогі над праваслаўем мелі некаторы дадатні ўплыў у беларускім жыцьці, але па першае гэта яшчэ належна не дасьледавана, а па другое і тады-б роля

рэлігіі была ўсё-ж бязьмежна далёкай ад тэй, якой хоча яе бачыць аўтар.

У разьдзеле аб Ігнаце Грынявіцкім і яго беларускім народніцтве спасьцерагаецца вялікая распятасьць між ідэалізаваньнем Грынявіцкага, як „сапраўды годнага наступніка Кастуся Каліноўскага“ і беларускага народніка, а тымі аб'ектыўнымі дадзенымі, каторыя гэта пацьвярджаюць.

Праводзячы сынтэтычнае параўнаньне „Мужыцкае Праўды“ і „Гоману“, аўтар не дацэнівае ролі гоманцаў у крысталізацыі беларускага нацыянальнага прынцыпу і ў канцавых сваіх вывадах даходзе да пэўных супярэчнасьцяў. Бо, як відаць нават толькі з цытаванага аўтарам, неазаглаўленага артыкулу аб нацыянальным пытаньні, гоманцы мелі цалком ясны і шырокі пагляд на беларускае нацыянальнае пытаньне, зьмест якога быў той, што гоманцы лічылі беларускі народ зусім самастойным, маючым права на незалежнае існаваньне, роўны іншым, прычым абарону гэтых правоў беларускага народу гэтак ад Палякоў, як і Маскоўцаў, гоманцы лічылі за сваю мету. Гоманцы адкідалі толькі гэткае паняцьце нацыяналізму, пры каторым адна нацыя ўважае сябе за вышэйшую ад другой (адсюль г. зв. „нямецкі дух“, „рускі дух“, і г. п., інакш шовінізмы і нетолеранцыя адносна іншых нацыяў). Гоманцы выразна і заявілі, што гэткага роду „беларускі дух“ (інакш беларускі шовінізм) ня можа быць складовай часткай беларускага здаровага нацыяналізму. Не адкарастываліся затым гоманцы ад беларускага здаровага нацыяналізму, але не хацелі ў ім бачыць „беларускага духу“ — шовінізму. Гэтак і трэба разумець іхнюю нацыянальную ідэолёгію. Той-жа факт, што гоманцы, як рэвалюцыянеры, мала зьвярталі ўвагі на культурную працу ў народзе, аддаючы гэта „аматарам“, ня можа падважыць вартасьці іхняе нацыянальнае сьведамасьці, ды і ўрэшце ішлі яны тут за прыкладам расейскіх народнікаў-рэвалюцыянераў, каторыя таксама не зьвярталі ўвагі на культурную працу, імкнучыся перадусім да зьмены палітычных умоваў жыцьця. З гэтых прычынаў не згаджаемся з аўтарам, быццам Фр. Багушэвіч ёсьць першым тварцом беларускага здаровага нацыяналізму ў сучасным яго разуменьню. Трэба думаць, што пагляды гоманцаў былі ведамы Багушэвічу і значэньне яго палягае ласьне на тым, што ён першы пачаў сапраўды беларускую нацыянальную працу на нашае культурна-грамадзкае ніве, тады як гоманцы праводзілі яе ў сэнсе выключна палітычным.

Ня гледзячы аднак на гэтыя няточнасьці, праца кс. Ад. Станкевіча мае вялікія дадатныя староны і перадусім ёсьць яна крыніцай, з якой можна даведацца аб вытоках беларускае сувэрэннае ідэі, ейным разьвіцьці і спробах зьдзейсьненьня. Ясны і лёгкі стыль, каторы адзначае агулам усе працы кс. Ад. Станкевіча, робіць разгляданы „нарыс“ даступным кожнаму. Праца гэта набірае і будзе набіраць кожны раз асабліваe актуальнасьці з нагоды штогодніх угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі

(25. III. 1918 г.) і ўжо з гэтай прычыны павінна знайсьціся ў біблятэцы кожнай беларускай арганізацыі і на стале кожнага сьведамага нацыянальна Беларуса. *М. Шкялёнак.*

І. Любан. Разграміць рэшткі нацдэмаўшчыны і трацкізма ў музыцы. Літаратура і Мастацтва, № 7 (1135) і № 17 (1145), Менск, 1935.

Працэс вялікай перабудовы грамадзка-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцьця ў Саветах, на аснове марксіцка-ленінска-сталінскай навукі — дзеля асягненьня проблематычнага бясклясавага грамадзтва—адбываецца плянова і рашуча.

З увагі на склад нацыянальны насельніцтва Савецкага Саюзу, перабудова адбываецца там паводле ведамага, мэтодолёгічнага характару, прынцыпу — лёзунгу: нацыянальная форма — соцыялістычны зьмест, пры гэтым зьмест соцыялістычна-пролетарскі.

Згодна з гэтым прынцыпам творацца там новыя цывілізацыйныя і культуральныя вартасьці, коштам нівэляцыі нацыянальных вартасьцяў і спэцыфічных—будучых з нашага гледзішча творчымі стымуламі — індывідуальных уласьцівасьцяў народаў Савецкага Саюзу.

Два інформацыйныя артыкулы, пад пададзеным вышэй вымоўным і крыклівым загалоўкам, І. Любана, цяперашняга старшыні Саюзу Савецкіх кампазытараў БССР,— ор'ентуюць нас часткова аб працэсе соцыялістычнага будаўніцтва ў галіне музыкі ў Беларускай ССР, а такжа аб перашкодах стаўленых гэтаму будаўніцтву г. зв. „контрэволюцыяй". — Артыкулы маюць характар „самакрытыкі". З нястачы месца ў нашым часапісе, ня можам перадрукаваць цэласьці іх, і дзеля гэтага спыняемся на найбольш характэрных цытатах.

Любан — сказаўшы напачатку, што „разам з бурным ростам усяе соцыялістычнае гаспадаркі Савецкае Беларусі расьце і разьвіваецца музычны фронт БССР: музычная асьвета, выканаўчая і творчая музычная думка"... — пераходзе да кароткае агаворкі вынікаў працы беларускіх савецкіх кампазытараў за 1934 г.

„Дзесяткі гармонізацый народных песень: беларускіх, польскіх, рускіх, яўрэйскіх, дзесяткі масавых песень піонерскіх, калгасных, чырвона-армейскіх, цэлы рад музычных буйных палоцен, як сымфанічныя паэмы, сымфоніі — вось творчы вынік працы савецкіх кампазытараў БСРР за 1934 г." — кажа Любан.

Далей аўтар успомніўшы аб характэрнай рабоце — музычным помніку Мірону Кіраву, у які ўвашлі творы кампазытараў Туранкова, Аладава, Любана, Цікоцкага, Палонскага, Падкавырава, Багатырова, а такжа аб, дапасаванай да г. зв. савецкага рэалізма, тэматыцы музычнай творчасьці, спыняецца даўжэй на „контрэвалюцыі" у музыцы ў БССР.

„Музыка ў БССР — кажа Любан — разьвіваецца ў жорсткай клясавай барацьбе супроць рэштак ворагаў пролетарыята, якія

пранiклi выключна са шкоднiцкiмi i здраднiцкiмi (!) мэтамi на ўчасткi соцыялiстычнай гаспадаркi i культуры. Клясавыя ворагi, контрэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты, вялiкадзяржаўныя шавiнiсты, былыя царкоўнiкi, чорнасоценцы пранiклi таксама i на музычны ўчастак соцыялiстычнага будаўнiцтва. Яны iмкнулiся i iмкнуцца праз музыку прышчапiць працоўным свае варожыя контрэвалюцыйныя iдэi".

„Былое нацыянал-дэмакратычнае кiраўнiцтва Наркомасьветы i Iнбелкульту (Балiцкi, Iгнатоўскi, Ластоўскi) наваднiлi Савецкую Беларусь музычнымi „спецамi", ад'яўленымi (!) контрэвалюцыянерамi, чорнасоценцамi, нацдэмамi (Прохараў, Анцаў, Грыневiч i К⁰)".

„КП(б)Б своечасова расшыфравала i выгнала шкоднiкаў, контрэвалюцыйных нацдэмаў з усiх участкаў соцыялiстычнага будаўнiцтва, у тым лiку i з фронту музыкi. Разам з гэтым праведзена вялiкая выхаваўчая работа з кампазытарамi, якiя раней знаходзiлiся пад уплывам i ў палоне нацдэмаў".

„Пазьней у 1932—1933 гадох у БССР паяўляецца на гарызонце другая група шкоднiкаў, якiя ўжо не адкрыта, а „цiхай сапай" шкодзiлi музычнаму фронту БССР. Я — кажа Любан — маю на ўвазе контрэвалюцыйную групу прафэсара Шэпелеўскага, Панаевай, якая пад крылком „комунiста" перараджэнца Казакова тварыла сваю агiдную (!) справу. Чыстка партарганiзацыi Белдзяржкансэрваторыi выявiла гэты контрэвалюцыйны гнайнiк(!)".

„Зусiм не так даўно (1934 г.) у кансэрваторыю быў запрошаны нехта Бергельсон для выкладаньня гiсторыi музыкi. Праз некалькi месяцаў яго „работы" высьветлiлася, што гэта прахадзiмец, троцкiст, якi асьмелiўся пець дыфiрамбы здраднiкам (!) рабочага класа Троцкаму (Бергельсон у сьнежнi месяцы 1934 г. знят з работы i выгнан з БССР).

Выгнаны з Беларусi ў 1928 годзе Прохараў, у кастрычнiку месяцы 1934 г. зноў паяўляецца ў Беларусi. Ён паяўляецца на трыбуне Акадэмii Навук у якасьцi лектара".

Далей спыняецца Любан на „адным з важных участкаў музычнай культуры,—гэта на ўчастку крытыкi", якi „найбольш слабы, найбольш незабясьпечаны савецкiмi кадрамi". I тут аўтар расправуляецца з „двурушнiкам", „ворагам ленiнскай нацыянальнай палiтыкi", „антыпролетарскiм контрэволюцыянэрам" Ю. Дрэйзiнам, чалавекам, якi праз друк, праз радыё, ды ў шматлiкiх канцэртах „адукоўваў працоўныя масы", а якi „зняты з работы ў кансэрваторыi за нацдэмаўскiя установкi ў выкладаньнi гiсторыi музыкi".

Даўжэй Любан спыняецца на Дрэйзiне — крытыкуе ягоны артыкул „Музыкальная жизнь Белоруссии", зьмешчаны ў маскоўскiм часапiсе „Советская Музыка" № 7, 1934 г. Артыкул, паводле Любана, „зьяўляецца згусткам нацдэмакратычных iдэй па лiнii мастацтва ў БССР". А вось шэраг фактаў, якiмi Любан iлюструе „вiну" Дрэйзiна:

1) што ў лік зьбіральнікаў беларускіх народных песень Дрэўзін залічыў „ярага нацдэма, агента польскага фашызма (!) Рака-Міхайлоўскага;

2) работа Прохарава, якая паводле Любана „акрамя шкоды, акрама насаджэньня нацыяналістычных ідэй“ нічога для Беларусі не дала, паводле Дрэйзіна, зьяўляецца „крокам наперад на шляху разьвіцьця беларускай музыкі“;

3) Дрэйзін у артыкуле сказаў: „Только в 1928 г. был напечатан сборнік из 318 песен, записаных у певицы Проси Гарецкой, крестьянки деревни Богатьковки Мстиславльского района. Мелодии этих песен записаны А. Егоровым, тексты — сыном певіцы, М. Гарецким“. — Паводле Любана ня трэба было гаварыць аб гэтым зборніку, бо ён зьмяшчае „шмат кулацкіх і антысэміцкіх песень, наўмысьля падабраных нацдэмам Гарэцкім“.

4) Дрэйзін напісаў: „Наконец не малое значение в области музыки имеют и Бел. гос. драматические театры (всего в Белоруссии три театра)“. — Любан ставіць закід Дрэйзіну, што гэта „паклёп на тэатральны фронт Савецкай Беларусі“, бо „акрамя пяці беларускіх дзяржаўных тэатраў... маем на Беларусі яўрэйскі дзяржаўны тэатр БССР, Трамы і рад іншых тэатральных прадпрыемстваў“;

5) Дрэйзін піша: „Белоруские композиторы, а также музыковеды и критики после исторического постановления ЦК ВКП(б) от 23 апреля 1932 г. об'единены в Союз Белорусских Композиторов“. Трэба, паводле Любана, пісаць не Союз Белорусских Композиторов, а „С а ю з с а в е ц к і х к а м п а з ы т а р а ў Б е л а р у с і“.

Далей Любан вініць Дрэйзіна, што даючы ацэнку і пералічваючы творы паасобных кампазытараў у артыкуле „наўмысьля замоўчываў нацдэмаўскія „памылкі“ гэтых кампазытараў, — паказываючы ўсе іх „шкодныя“ творы, (ад якіх цяпер самі кампазытары ўжо адмовіліся), „як дасягненьні беларускай культуры“. Нпр. да заслуг кампазытара Аладава Дрэйзін адносіць опэру-жарт (на лібрэтто Дрэйзіна) „Тарас на парнасе“, — забаронены і асуджаны „нацдэмаўскі“ твор; музычнае афармленьне Тэраўскім п'ес „Кастусь Каліноўскі“, „Кар'ера Брызгаліна“, „Панскі гайдук“ і ін., п'ес, якія „знятыя з рэпэртуару, як шкодныя, ня маючыя нічога супольнага з пролетарскім тэатральным мастацтвам — як кажа Любан — Дрэйзін залічае да вялікіх дасягненьняў у беларускай музыцы. Далей, Дрэйзін дадатна ацаніў зборнік вайсковых песень Тэраўскага, гдзе надрукаваны „Ваяцкі марш“, — ведамы і ў Зах. Беларусі, а напісаны, паводле Любана, „на словы нейкага ксяндза“. Як нам ведама, аўтарам слоў таго маршу—зьяўляецца Краўцоў Макар, а ня „нейкі ксёндз“. Тыя самыя „нацыяналістычныя памылкі“ Любан бачыць у ацэне Дрэйзіным творчасьці Мацісона, Цікоцкага (гэтым апошнім „написана — кажа Дрэйзін — белорусская симфония, белорусская прелюдия“). І ўрэшце „віна“ Дрэйзіна ў тым, што ў ягоным артыкуле „няма ніводнага слова наконт вялікай выхаваўчай работы, праведзенай пралетарскай грамадзкась-

цю пад кіраўніцтвам КП(б)Б па перавыхаваньню і пераўзбраеньню кампазытараў, якія ў свой час папалі ў палон нацдэмаў".

А вось іншыя характэрныя „памылкі".

Даючы лекцыі з гісторыі музыкі ў кансэрваторыі, Дрэйзін азначае музыку, кажа Любан, так: „музыка, рэальна кажучы, гэта злучэньне таноў". — А паводле Любана — „музыка, як надбудова на матэрыяльным базісе, зьяўляецца прадуктам вытворчых і клясавых узаемаадносін". — Паводле Любана Дрэйзінаўскае азначэньне музыкі — „вульгарна-мэханістычная ўстаноўка"!..

Далейшай „віной" Дрэйзіна, што ў лекцыях, гаворачы аб крытыцы, сказаў так: „Аб'ектыўнай крытыкі ня было, няма і ня будзе, можа быць толькі крытычна-мастацкі падыход",—сказ, паводле Любана, нязгодны з марксыцкай крытыкай.

Ня будзем тут даўжэй спыняцца на „памылках" Дрэйзіна, якіх ён паводле Любана дапусьціўся ў сваей працы ў галіне музыкі. — Любан, закідаючы сабе не адзін раз у артыкулах брак бальшавіцкай пільнасьці, у канцы другога артыкулу кажа: „Перад сэкцыяй савецкіх кампазытараў, радыёкамітэтам, перад дзяржаўнай консэрваторыяй стаіць неадкладная задача: у лекцыях, канцэртах і ўва ўсей масавай музычнай рабоце паказаць перад усей пралетарскай грамадзькасьцю ўсю контрэвалюцыйную сутнасьць людзей, якія шмат нашкодзілі на музычным фронце (Прохараў, Дрэйзін, Бергельсон і інш.). — Беларускі тэатр опэры і балета павінен неадкладна дэталёва пераглядзець усе пераклады опэр, зробленыя Дрэйзіным, бо яны засьмечаны нацдэмаўскай тэрмінолёгіяй, палянізмамі, архаізмамі... — Толькі ачысьціўшыся ад нацдэмаўскага трацкісцкага хламу музычны фронт БССР... узьнімецца на вышэйшую ступень".

Вышэйпададзеныя цытаты з артыкулаў Любана і ўзятыя ім цытаты з артыкулу Дрэйзіна, апроч інформацыйнага значэньня, маюць для нас тую вартасьць, што сьведчаць, пэўне-ж часткова, аб „соцыялістычным будаўніцтве" ў музыцы ў БССР, як і аб перашкодах, што ставяцца гэтаму будаўніцтву г. зв. „контрэвалюцыяй", а прадусім г. зв. беларускімі нацыянал-дэмакратамі.

Трэба тут дадаць, што ў сёлетнім 3-цім нумары часапісу „Літаратура і Мастацтва" ў перадавіцы „Патрэбна карэнная перабудова" шмат гаворыцца аб ідэолёгічных нястачах ува ўсіх галінах мастацтва ў БССР (літаратура, выяўленчае мастацтва, тэатр, музыка і гэт. д.) і што ў гэтым вінавацяцца паўперад Народны Камісарыят Асьветы і яму падуладныя ворганы.

Трэба думаць, што і тут маем дзела перадусім з „нацдэмаўскай контрэволюцыяй"!

Я. Шутовіч.

Хроніка

═ Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і Таварыства Беларускае Школы распачалі супольна акцыю сярод шырокіх гушчаў беларускага народу ў Зах. Беларусі ў справе складаньня польскім школьным уладам дэкляарацыяў з дамаганьнем беларускай школы.

Як ведама, цяпер Беларусы пад Польшчай, якіх нават паводле дзяржаўнага перапісу насельніцтва з 1931 г. ёсьць 1 міліён 600 тысяч, а ў сапраўднасьці больш 2.500,000, беларускай школы ня маюць, калі ня лічыць 69 пачатковых школ, у якіх паводле віленскага школьнага куратара „język białoruski uwzględniony", і беларускай філіі польскай дзяржаўнай гімназіі ім. Славацкага ў Вільні.

Да школьнай акцыі ў 1936 г. трэба прыступіць усім Беларусам!

═ Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры ў Вільні ў канцы мінулага году дзеля навуковых мэтаў наладзіў абмен выданьнямі з Беларускай Акадэміяй Навук у Менску. Часьць з прысланых Акадэміяй выданьняў Інстытут ужо атрымаў, часьць аднак віленскае гарадзкое староства затрымала і зажадала ад Інстытуту дазволу на атрымліваньне савецкіх выданьняў. У сувязі з гэтым, Інстытут ад сьнежня мес. м. г. робіць стараньні перад адноснымі адміністрацыйнымі ўладамі ў справе атрыманьня дазволу. Трэба ведаць, што некаторыя віленскія польскія і жыдоўскія навуковыя і культурнаасьветныя ўстановы дазвол на атрымліваньне сав. выданьняў маюць. Магчыма, што яго дастане і Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, як навуковая ўстанова.

═ Віленскі Аддзел Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры дзеля пашырэньня ведаў аб Беларусі сярод шырокіх гушчаў віленскага грамадзянства арганізуе цыклі лекцыяў. Ад 24 лістапада м. г. да 1. III. б. г. ужо адбылося 8 лекцыяў. 24. XI. і 8. XII. 1935 г. дзьве папулярныя лекцыі з гісторыі і літаратуры прачытаў др. Я. Малецкі. Пяць лекцыяў на тэмы гістарычныя 26. I, 2, 9, 16 і 24. II. 1936 г. прачытаў доўгалетні старшыня Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры, заслужаны грамадзкі і культурны дзеяч а. В. Гадлеўскі. Прэлегент узброіўшыся навуковымі аргумантамі і багатым арсэналам гістарычнай веды ўжо разгледзіў прагісторыю і старадаўнюю гісторыю Беларусі. Восьмую лекцыю аб слаўным беларускім друкару др. Францішку Скарыне і ягонай працы, з нагоды прыпадаючага сёлета 450-лецьця ад дня нарадзін Скарыны, прачытаў 1.III. сябра рэдакцыйнай калегіі нашага часапісу а. А. Станкевіч.

═ 26. I. і 24. II. па лекцыях выступаў Хор віленскага Аддзелу Інстытуту, які пад кіраўніцтвам інж. А. Клімовіча сьпяваў беларускія народныя песьні.

═ Хор Віленскага Аддзелу Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры апошнім часам значна ўзмоцніў працу. — Пры Хоры існуе бясплатны прыгатаваўчы курс нотазнаўства. — Хор часта выступае на г. зв. „нядзельніках", арганізаваных тым-жа Аддзелам Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

═ У Беларускім Навуковым Таварыстве ў Вільні ад Новага Году адбыліся два паседжаньні языкаведнае сэкцыі і па адным паседжаньні сэкцыі гістарычнае і літаратурна-мастацкае. — Закончана парадкаваньне багатае Бібліётэкі Т-ва. — Т-ва ў апошнія гады зварачвала ўвагу на працу ў Беларускім Музэі ім. Івана Луцкевіча, у якім працаваў так-жа рад замежных навукоў-

цаў (праф. Станг з Ослё, прафэс. Фальк—Швэцыя, Дэ-Віля—Гішпанія і т. д.).

═ У Беларускім Студэнцкім Саюзе ў Вільні ад Нова'а 1936 году адбылося некалькі рэфэратаў, спасярод якіх дня 25. II. на тэму „Час і месца паўстаньня стара-крывіцкага (старабеларускага) літаратурнага языка", і дн. 3. III. на тэму „Повесьці і апавяданьні беларускіх летапісцаў". Прэлегэнт др. Я. Станкевіч

═ У выніку літаратурнага конкурсу на найлепшае апавяданьне, зарганізаванага месячным часапісам беларускай моладзі „Шлях Моладзі" ў мінулым годзе, з пасярод агульнага ліку 17 апавяданьняў і новэляк, прысланых на конкурс, конкурсны суд прызнаў найлепшым апавяданьне Андрэя Чэмера „На родным палетку". Апавяданьне „На родным палетку" будзе надрукавана ў „Шляху Моладзі".

═ 15. I. б. г. у саюзе польскіх літаратараў у Вільні адбыўся прысьвечаны беларускай літаратуры вечар („środa Literacka"). З рэфэратамі ў польскай мове выступалі гр. А. Луцкевіч і мгр. Ст. Станкевіч. Першы прэлегент даў агляд беларускай літаратуры ў пэрспэктыве гістарычнай. Трэба шкадаваць, што рэфэрат ня выпаў удачна — ня быў сынтэтычны, прэлегент зашмат без патрэбы гаварыў аб дробязях. Другі прелегент, мгр. Ст. Станкевіч, зрэфэраваў стан бел. літаратуры ў Сав. Беларусі. Рэфэрат ягоны значна перавышаў рэфэрат папярэдніка, як сваей конструкцыяй, сынтэтычным уняцьцем, так і зьместам пераважна інформацыйнага характару, — дзеля чаго быў выслуханы з вялікім зацікаўленьнем.

═ Нашыя супрацоўнікі-песьняры: Міхась Машара і Я. Пачопка працуюць цяпер: першы над п'есай, мясцамі вершаванай, п. з. „Дзеці сонца", другі над поэмкай „Рыбак і Русалкі" — пабудаванай на беларускім народным фольклёры.

═ Максім Танк, адзін з уталентаваных паэтаў Заходняй Беларусі, якога творы ўжо паказываюцца ў друкаваным выглядзе ў бел. прэсе ў Вільні, піша цяпер апавяданьне з сялянскага жыцьця, п. з. „Папярок загонаў". Апроч таго піша поэму п. з. „Нарач", у якой аўтар дасьць абраз беларускага „мора" Нарачы, адмалюе жыцьцё беларускіх наднарачанскіх рыбакоў, іх барацьбу за свае нацыянальныя і соцыяльныя правы.

═ Кампазытар Казура напісаў опэру „Powrót", у якой музыка — па стылю бізантыйскацаркоўная — пераплятаецца беларускімі народнымі мотывамі. Нпр. „Malitwa" ў опэры мае мэлёдыю беларускай песьні „Быстра рэчанька". — Опэра канчаецца беларускай песьняй „Ой пара дамоў, пара, ужо вячэрняя зара", якую пяе пабеларуску народ вяртаючыся з поля.

═ Трэці Пленум Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў СССР адбыўся ў Менску дня 10—16. II. 1936 г. На пленум зьехаліся прадстаўнікі нацыянальных літаратур Савецкага Саюзу — паэты, празаікі, драматургі. Пленум прысьвечаны пытаньням разьвіцьця сав. літаратуры. На парадку дня былі даклады: Клімковіча і Александровіча — аб беларускай літаратуры, Сенчэнкі — аб паэзіі Украінскай ССР, Суркова — аб паэзіі РСФСР., Тагірава — аб башкірскай літаратуры. Выслухаўшы даклады і дыскусыі па іх, пленум прыняў адносна беларускай і башкірскай сов. літаратуры рэзалюцыі.

═ Да пленуму Дзяржаўнае Выдавецтва БССР выпусьціла рад кніг з мастацкай літаратуры: „Анталёгія рускай паэзіі", „Дзень другі" Эрэнбурга, трэці том „Ціхага Дона" Шолахава. „Як гартавалася сталь" Астроўскага, „Вядучая вось" Ульенкава (у перакладах на беларускую мову); першы том трохтомніка выбраных твораў Я. Коласа, другі том выбраных твораў Я. Купалы, трэці том (проза) выбраных твораў Міхася Чарота, поэма „Цені на сонцы" і „Падарунак дзеткам-малалеткам" Александровіча і інш.

═ Дзяржаўнае Выдавецтва БССР падрыхтавала 250 біблётэчак

з твораў пісьменьнікаў БССР дзеля раздачы ўчасьнікам пленуму; зарганізавала выстаўку літаратуры, выданай Д. В. Б — У будынку дзяржаўнай бібліётэкі зарганізавана выстаўка выданьняў Бел. Акад. Навук. — У доме мастака саюз сав. мастакоў БССР зарганізаваў выстаўку каля 50 абразоў, гравюр і скульптур лепшых мастакоў і скульптараў БССР. — Дзяржаўная бібліётэка і біблёграфічны інстытут ім. Леніна зарганізавалі выстаўку твораў каля 70 пісьменьнікаў СССР.

═ 15 лютага адбылася ў Менску чарговая сэсія Беларускай Акадэміі Навук, прысьвечаная справам арганізацыйным. Сэсія прыняла да ведама просьбу Горына звольніць яго ад абавязкаў сябры прэзыдыюму і прэзыдэнта Акадэміі, выбрала ў сапраўдныя сябры Акадэміі і на прэзыдэнта яе Івана Захар'евіча Сурту. Сэсія выбрала камісію (у складзе Сурты, Шчарбакова і Бурстына), дзеля апрацоўкі новага статуту Акадэміі.

* * *

Нававыбраны прэзыдэнт Белар. Акад. Навук І. З. Сурта нарадзіўся ў 1893 г. у сям'і селяніна-беларуса ў вёсцы Бяседавічы, Магілеўскай губэрні. У 1914 г. скончыў сярэднюю мэдыцынскую школу, у 1928 г. скончыў мэдыцынскі факультэт 2-га МДУ, у 1932 г. скончыў інстытут чырвонай прафэсуры прыродазнаўства. З ліпня 1932 г. да сьнежня быў віцэпрэзыдэнтам Бел. Акадэміі Навук. З канца 1933 г. Сурта працаваў наркомам аховы здароўя БССР. — Зьяўляецца сябрам бюро ЦК КП(б)Б і сябрам прэзыдыюму ЦВК БССР. Навуковыя заінтэрасаваньні Сурты накіраваны прадусім у прыродазнаўства.

Цяпер Сурта працуе над праблемамі гісторыі навукі прыродазнаўства і рэдагуе два разьдзелы Беларускай Савецкай Энцыклёпэдыі (біолёгіі і мэдыцыны).

═ Беларускаа Акадэмія Навук атрымала пісьмы ад унівэрсытэтаў Каліфорніі, Новай Зэляндыі, Канады, Славянскага Інстытуту Парыскага унівэрсытэту з прапановай устанавіць культурную сувязь і абмен выданьнямі. У прыватнасьці унівэрсытэты просяць прыслаць „Запіскі Беларускай Акадэміі Навук“, працы ў галіне флёры, фаўны, мовы, мэдыцыны і гісторыі Беларусі.

У сучасны момант Беларуская Акадэмія Навук падтрымлівае сувязь і наладзіла абмен навуковымі выданьнямі з 200 унівэрсытэтамі, акадэміямі, бібліятэкамі і іншымі навуковымі і культурнымі установамі 36 краін сьвету. Сюды ўваходзяць Злучаныя Дзяржавы Амэрыкі, Англія, Францыя, Нямеччына, Польшча, Японія, Баўгарыя, Чэхаславакія і інш.

═ Інстытут Літаратуры і Мовы Беларускай Акадэміі Навук скончыў складаньне беларускага арфаграфічнага слоўніка. Слоўнік налічае 20 000 слоў. Падрыхтоўваецца вялікі руска-беларускі слоўнік у двух тамох, — 75.000 слоў. Першы том (зьмяшчае літары ад „а“ да „о“) ужо апрацаваны. Выдаецца беларуская навуковая граматыка ў трох частках. Першая частка (фонэтыка) вышла ў мінулым годзе. Складаньне другой часткі (марфалёгія) ужо канчаецца.

═ Інстытут Эканомікі Беларускай Акад. Навук скончыў працу — статыстычна-эканамічнае апісаньне раёнаў БССР. Апісана 90 раёнаў і Менск. Увесь сабраны матарыял ўвойдзе у спэцыяльны зборнік „Статыстыка — эканамічнае апісаньне раёнаў БССР.

═ Археолёгічныя знаходкі. Археолёгічнымі экспэдыцыямі Бел. Акад. Навук у працягу апошніх шасьці год былі знойдзены і сабраны на тэрыторыі БССР некалькі тысяч касьцей. Цяпер у БАН адбываюцца над імі досьледы. Палеонтолёгі, з учасьцем старшага палеонтолёга Усесаюзнай Акадэміі Навук, Грамова, што спэцыяльна прыехаў ў Менск дасьледжываць косьці, сьцьвярджаюць вялікае навуковае значэньне археолёгічных знаходкаў. Разбор касьцей ужо даў магчымасьць высвачыць, якія жывёліны былі і спажываліся ў харчах

чалавекам у даўнюю пару. Удалося ўстанавіць, што ў мястэчку Юравічы на рацэ Прыпяці, Мозырскага раёну, знаходзілася стаянка чалавека старажытна-каменнага веку. Чалавек паляваў на мамантаў. Стаянка налічвае 25—30 тысяч год. Асабліва цікавымі ёсьць косьці, знойдзеныя ў гарадзішчы каля вёскі Загорцы на рацэ Ловаці, Мехаўскага раёну. Тут вадзіліся зубры, алені, бабры, лосі, а з хатняй жывёлы — бык дробнай пароды, бараны, коні. Устаноўлена, што хатні бык паявіўся за 3 тысячы год да хрысьціянскай эры, а гарадзішча адносіцца да першых вякоў гэтае эры, — у эпоху раскладу радовага грамадзтва. Із знойдзеных касьцей маманта для гэолёгічнага музэю Бел. Акадэміі Навук складаецца шкялет маманта, а з касьцей жывёлы адбіраюцца для музэю калекцыі.

═ У выданьні дзяржаўнага выдавецтва БССР вышла з друку ў перакладзе на беларускую мову першая кніга (5—8 тамы) поўнага збору твораў Максіма Горкага. Ахапляе яна творчасьць пісьменьніка за час 1901—1905 гады. Усё выданьне твораў — 25 тамоў — разьлічана на тры гады.

═ Усебеларускі (Сов. Беларусь) радыёфэстываль адбыўся паміж 25. II. і 5. III. Фэстываль арганізаваў радыёкамітэт у Менску. Выступалі лепшыя драматычныя і музычныя выканаўцы радыёкамітэта. Перадачы трансляваліся з работніцкіх клюбаў, фабрык, заводаў, калгасаў і т. д.

═ У Гомелі адкрыўся навукова-дасьледчы трахоматозна-акулістычны інстытут.

═ Народны камісарыят асьветы БССР правёў у раёнах БССР сэмінары з гісторыі народаў СССР, дзеля павышэньня кваліфікацыі настаўнікаў трэцяе і чацьвёртае клясаў пачатковых школ. Сэмінарамі было ахоплена каля 5000 сельскіх настаўнікаў.

═ У сувязі з XVIII гадаўшчынай чырвонай арміі „Усебеларускі цэнтральны гістарычны музэй" у Менску зарганізаваў выстаўку пад наз. „Чырвоная армія ў выяўленчым мастацтве". На выстаўцы 246 фрагмэнтаў абразоў сав. мастакоў. Падобная выстаўка зарганізавана ў Пэдагогічным Інстытуце (унівэрсытэцкі гарадок).

═ П'еса беларускага сав. пісьменьніка Міхася Чарота „На Купальле" апрацавана музычна кампазытарамі Тэраўскім і Цікоцкім. Ёсьць яна першай беларускай савецкай опэрай, пабудаванай на багатым беларускім народным фольклёры.

═ У Менску адбылася сэсія г. зв. вучонага савету ўсесаюзнага навукова-дасьледчага інстытуту балотнай гаспадаркі.

Выслухана 13-цаць навуковых дакладаў. Сэсія прыняла прапанову інстытуту аб ахваце ў бягучым годзе досьледамі ня менш 100 калгасаў, у тым ліку 50 у БССР, з тым, каб дабіцца ў іх лепшых ураджаяў.

═ У Менску пачала працаваць дзяржаўная капэля БССР. Заданьнем капэлі — знаёміць працоўныя масы з народнай творчасьцю, клясычнай спадчынай, з творчасьцю кампазытараў БССР і іншых савецкіх рэспублік.

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Рэдакцыйная Калегія: М. Шкялёнак, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Беларуская Борць, № 7 (12), 1935 і № 1—2, 1936. Вільня.
Наша Воля, № 1, 1935, і № 1, 2, 3, 4, 1936. Вільня.
Новы Шлях, № 2 (17) 1936. Вільня.
Записки Наукового Товариства им. Шевченка, т. CLIII, 1935. Львоў.
Дзвони, ч. 12, 1935, ч. 1—2, 1936. Львоў.
Назустріч, ч. 4, 5, 1936. Львоў.
Рідна Мова, ч. 1, 2, 3, 1936. Варшава
Наш Світ, ч. 1, 2, 3, 4, 5, 1935, ч. 1, 1936. Луцк.
Український Бескид, ч. 1—8, 1936. Перамышль.
Центральная Европа, № 1, 1936. Прага.
Prehled, č. 20, 1935. Прага.
Život, č. 21, 24. 1935, č. 1—2, 3, 4, 1936. Прага.
Slovansky Prehled, č. 10, 1935. Прага.
Katolik, Č. 2, 1936. Прага.
Oriens, сшыток 1, 1936. Кракаў.
Środy Literackie, № 1,2,3, 1935. Вільня.
Włóczęga, № 5—1, 1935—1936, № 2, 1936. Вільня.
Poprostu, № 11, 12, 13, 14.

Ад Рэдакцыі:

Друкаваньне наступнай (2-й) кніжкі „Калосься“ пачнецца 1-га красавіка. У сувязі з гэтым, просім паважаных супрацоўнікаў паруціцца прыслаць матарыялы ў тэрміне.